16+

Літ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 14 (5223) 7 красавіка 2023 г.

ISSN 0024-4686

Задачы на сёння і заўтра стар. 4

Што там, за даляглядам? стар. 12

Каханне заўсёды ў цэнтры стар. 14

Вясна па нотах

Фота Іны Карпук.

Падчас адкрыцця фестывалю.

Упершы красавіцкі дзень на сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі ўрачыстым канцэртам распачаўся XXXVIII фестываль музыкі «Мінская вясна», які праводзіцца пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Сёлета падзея супала з важнай датай. Роўна 150 гадоў таму, 1 красавіка 1873 года, нарадзіўся слынны рускі кампазітар і піяніст Сяргей Васільевіч Рахманінаў. Ва ўсім свеце і ў сталіцы Беларусі адбываюцца святочныя імпрэзы. Паралельна з музычным фестывалем Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь дае серыю канцэртаў, прысвечаных юбілею кампазітара, «Рахманінаў+».

Традыцыйны міжнародны музычны форум сёлета пройдзе з 1 красавіка да 24 мая. Меламанаў чакаюць юбілейныя канцэрты, выступленні музыкантаў з сусветным іменем і сустрэчы з сапраўдным мастацтвам. Праграма маштабнай падзеі насычаная і разнастайная. «Мінская вясна» абяцае стаць грандыёзным завяршэннем святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 85-годдзю Белдзяржфілармоніі. Канцэрты фестывалю пройдуць у Вялікай канцэртнай зале і ў Малой зале імя Р. Шырмы.

Вось ужо больш за тры дзесяцігоддзі фестываль музыкі «Мінская вясна» нязменна здзіўляе гасцей Беларускай дзяржаўнай філармоніі яркімі і ўнікальнымі канцэртнымі праграмамі, натхняе і дорыць незабыўныя эмоцыі.

Працяг на стар. 2 ▸

«ЛіМ»-акцэнты

Актуальна. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звярнуўся з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. Тэма мерапрыемства — «Умовы захавання суверэнітэту і незалежнасці». Пытанні, якія ўздымаліся, датычыліся кожнага беларуса. «Тэмы, якія мы абмяркоўваем, — ад жыцця. У цэнтры рашэнняў, якія прымаем, — імкненне да захавання міру, стварэнне на карысць будучыні Беларусі, сацыяльная справядлівасць. Гэта нашы дэмакратычныя каштоўнасці, сапраўдныя каштоўнасці», — сказаў Кіраўнік дзяржавы.

Меркаванне. Час даказаў трываласць і непарыўнасць беларуска-расійскай дружбы, заснаванай на прынцыпах раўнапраўя, узаемнай павагі, даверу і падтрымкі, гістарычнай агульнасці і прыхільнасці да адных і тых жа духоўна-маральных каштоўнасцей, адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў віншаванні з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі. «Выконваючы волю народаў, мы паслядоўна нарошчваем патэнцыял Саюзнай дзяржавы. Мінск і Масква аб'ядноўваюць намаганні ў мэтах рэалізацыі комплексу мер стратэгічнага значэння, накіраваных на ўмацаванне суверэнітэту і паскоранае развіццё нашых краін», — падкрэсліў беларускі лідар. Імкненне двух народаў да яднання будзе служыць трывалым фундаментам для далейшага пашырэння шматпланавага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, гаворыцца ў віншаванні.

Віншаванні. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Расіі Ілью Рэзніка з 85-годдзем. «Выключны талент і творчая індывідуальнасць далі магчымасць Вам заняць пачэснае месца ў плеядзе прызнаных майстроў мастацтваў. Вашы творы, напоўненыя любоўю і стваральнай энергіяй, карыстаюцца заслужаным прызнаннем у беларускай публікі», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што і ў далейшым дзейнасць Ілы Рэзніка будзе садзейнічаць умацаванню дружбы і развіццю культурнага супрацоўніцтва паміж брацкімі народамі Беларусі і Расіі.

• Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста РСФСР Аляксандра Збруева з днём нараджэння. «Вы адносіцеся да ліку яркіх акцёраў сучаснасці, чые талент і працавітасць прайшлі выпрабаванне часам і сталі эталонам прафесійнага майстэрства. Кожная Ваша роля — гэта спалучэнне высакароднасці, сапраўднай мужнасці і інтэлігентнасці», — адзначыў Кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што бліскучыя работы Аляксандра Збруева заслужылі прызнанне і шчырую любоў гледачоў розных пакаленняў.

• Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста РСФСР Уладзіміра Вінакура з 75-годдзем. «Вашы яркі талент і тонкае пачуццё гумару на працягу многіх гадоў нязменна дораць гледачам шчырую радасць і добры настрой. У Беларусі высока цэняць і любяць Вашы неперайзыдзеныя рэпрызы і выдатныя сцэнічныя пастаноўкі», — адзначана ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што творчасць Уладзіміра Вінакура і ў далейшым будзе садзейнічаць умацаванню беларуска-расійскіх культурных сувязей.

Фестываль. Нядаўна падпісана распараджэнне, якім зацверджаны тэрміны правядзення XXXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Асноўныя мерапрыемствы пройдуць з 13 да 16 ліпеня 2023 года. У мэтах пашырэння аўдыторыі гледачоў распараджэннем прадугледжаны бязвізавы парадак уезду ў Рэспубліку Беларусь для ўдзельнікаў і гасцей фестывалю з 73 дзяржаў. З улікам практыкі дзяржаўнай падтрымкі фестывалю распараджэннем таксама прадугледжаны асобныя прэферэнцыі для яго арганізатараў і ўдзельнікаў.

Афіцыйна. Факультэт журналістыкі БДУ з 2023 года цалкам перастае рыхтаваць платнікаў. Такая інфармацыя змешчана на сайце Міністэрства інфармацыі Беларусі. Да таго ж факультэт будзе набіраць абітурыентаў толькі на дзве спецыяльнасці — «Журналістыка» і «Інфармацыя і камунікацыя». Згодна з планам прыёму на 2023 год, які апублікаваў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, набор у будучую прыёмную кампанію ў журфака складзе 82 чалавекі. Першакурснікаў прымуць на спецыяльнасці «Журналістыка» (60 чалавек) і «Інфармацыя і камунікацыя» (22 чалавекі).

Акцыя. На «Бібліяноч-2023», міжнародную акцыю ў падтрымку чытання, запрашаюць бібліятэкі Беларусі 21 красавіка. У Мінску свята кнігі будзе адзначацца ў Нацыянальнай бібліятэцы, Рэспубліканскай навуковай медыцынскай бібліятэцы, Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы імя М. Астроўскага, Цэнтральнай бібліятэцы імя Я. Купалы і іншых кніжніцах. З нагоды Дня кнігі бібліятэкі кожны год пашыраюць час, фармат працы і арганізуюць кніжныя выстаўкі, публічныя чытанні, акцыі і іншыя культурныя імпрэзы. Уваход на мерапрыемствы вольны.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Прэміі сталічнага аддзялення СПБ:

Савет Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі прысудзіў літаратурныя прэміі пісьменнікам аддзялення за найлепшыя кнігі, якія выйшлі ў 2021—2022 гг.

У намінацыі «Паэзія» прэмію імя Максіма Танка атрымалі: **Андрэй Душачкін** (за кнігу вершаў «Колесо на обочине») і **Віктар Шніп** (за кнігу вершаў «Васільковы мёд»).

У намінацыі «Проза» прэмію імя Івана Шамякіна атрымалі: **Наталля Саветная** (кніга аповесцей і апавяданняў «Затаённое слово») і **Яўген Хвалей** (раман «А на беразе тым»).

У намінацыі «Дзіцячая літаратура» прэмію імя Янкі Маўра атрымаў **Уладзімір Мазго** — за кнігу «Хутка стану чэмпіёнам».

У намінацыі «Публіцыстыка» прэмію імя Івана Новікава атрымаў **Віктар Паўлаў** — за кнігу нарысаў «Нам память не даёт покоя».

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Разам ствараць будучыню

У рамках мерапрыемстваў, прысвечаных Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, адбыўся міжнародны тэлемост «На літаратурнай хвалі», які аб'яднаў студыі ў Бранскай абласной навуковай універсальнай бібліятэцы імя Ф. І. Цютчава і ў Славянскай бібліятэцы-філіяле Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імі У. І. Леніна.

Ініцыятарам анлайн-форуму выступіў савет Гомельскага абласнога аддзялення Саюз пісьменнікаў Беларусі, а ўдзельнікамі сталі літаратары абласных аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі і Расіі, члены Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, удзельнікі аматарскіх літаратурных аб'яднанняў двух рэгіёнаў, маладыя аўтары і спецыялісты бібліятэк, чытачы.

У пачатку міжнароднага тэлемоста прагучалі прывітальныя словы ад старшынь творчых арганізацый Уладзіміра Гаўрыловіча і Ірыны Пянюковай, якія падкрэслілі, што для беларусаў і расіян гэтае свята сімвалізуе непарушнасць шматвяковага братэрства, імкненне нашых народаў разам ствараць будучыню. Кіраўнікі рэгіянальных арганізацый абмеркавалі шэраг сумесных перакладных праектаў. Як паведаміў Уладзімір Гаўрыловіч, з пачатку года 26 беларусаў падалі заяўкі і накіравалі свае работы на сумесны беларуска-рускі конкурс паэтычных перакладаў «Берагі дружбы». У міжнародным праекце ўдзельнічаюць сёлета і 15 бранскіх маладых паэтаў і прафесіяналаў, якія з задавальненнем перакладаюць з беларускай на рускую. Таксама вядзецца актыўная падрыхтоўка сумеснага зборніка паэзіі і прозы гомельскіх і бранскіх літаратараў. Кніга будзе прэзентавана ў верасні на XVIII Міжнародным фестывалі-свяце «Славянскія літаратурныя дажынкі», ганаровым госцем якога стане Бранская абласная арганізацыя.

Уладзімір МІКАЛАЕЎ

з нагоды

Вясна па нотах

Амаль два месяцы ў мінчан будзе магчымасць далучацца да вяршынь класічнай музыкі падчас правядзення «Мінскай вясны». Распачалося свята элегій і сімфоній урачыстым канцэртам «Рахманінаў+». У дзень нараджэння «рускага генія» 1 красавіка на сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі — Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор — народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў). Пад кіраўніцтвам дырыжора Валерыі Рыбінскай славуты калектыў выканаў Канцэрт № 3 рэ мінор для фартэпіяна з аркестрам. За фартэпіяна — Алена Навуменка, лаўрэат міжнародных конкурсаў. Твор напісаны кампазітарам у 1909 годзе і з'яўляецца на сёння адным з самых папулярных. Музычныя крытыкі Канцэрт № 3 рэ мінор для фартэпіяна з аркестрам называюць вяршыняй творчасці Сяргея Рахманінава пачатку XX стагоддзя. Акрамя твораў юбіляра, філарманічны калектыў выканаў Элегію з Серэнады до мажор для струннага аркестра П. Чайкоўскага.

Канцэрт № 3 рэ мінор для фартэпіяна з аркестрам — паўнавартасная і аўтэнтычная праца, якая раскрыла ўнікальны талент кампазітара, — прагучаў на ўсю моц з асаблівай паэтычнай чароўнасцю. Выканаўца сольнай партыі не супрацьстаіць аркестру, а, безумоўна, дамінуе над ім.

Не менш выбітным творам майстра даследчыкі музыкі лічаць і «Сімфанічныя танцы». Кампазіцыя была напісана Сяргеем Рахманінавым у 1940 годзе. Стымулам для стварэння сталі ўласныя перажыванні. Кампазітара вельмі турбавалі падзеі ў Францыі, акупіраванай нацысцкімі войскамі, таму што ў Парыжы знаходзілася яго дачка. У надзвычай кароткі тэрмін ён стварыў сімфанічнае сачыненне. Яно вылучаецца аўтабіяграфічнасцю і ўласнай гісторыяй.

Канцэртам-падзеяй абяцае стаць аўтарскі вечар Талібхона Шахідзі. 7 красавіка ўпершыню ў Беларусі будзе выканана музыка знакамітага таджыкскага і расійскага кампазітара. Шахідзі — народны артыст Рэспублікі Таджыкістан, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Рудакі, член Саюза кампазітараў і Саюза кінематаграфістаў Расіі.

Кампазітарскі стыль Талібхона Шахідзі адметны натуральным спалучэннем багацця еўрапейскага традыцыйнага мастацтва і каларыту нацыянальнай музычнай спадчыны.

Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам маэстра Аляксандра Анісімава прадставіць публіцы самыя вядомыя творы аўтара: Трэці канцэрт для фартэпіяна з аркестрам, вакальны цыкл «Недасканаласць нашага свету» на словы Поля Верлена, фрагменты з балетаў «Ліхвяр», «Рубаі Хаяма», сімфанічную паэму «Сада».

На аўтарскім вечары ўпершыню пасля доўгага перапынку выступіць знакамітая піяністка Кацярына Мячэціна — салістка Маскоўскай дзяржаўнай акадэмічнай філармоніі, заслужаная артыстка Расійскай Федэрацыі. У яе выкананні прагучыць Трэці канцэрт для фартэпіяна з аркестрам.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Фота Кастуся Дробава.

Белдзяржфілармонія.

Працягнуць урачыстасць два юбілейныя канцэрты, якія займаюць асаблівае месца ў праграме фестывалю «Мінская вясна».

У сераду, 26 красавіка, у Вялікай канцэртнай зале адбудзецца святочны вечар Ніны Шарубінай. У 2023-м салістка Вялікага тэатра, народная артыстка Беларусі адзначае 20-годдзе творчай дзейнасці. У яе рэпертуары шырока прадстаўлены рамансы розных часоў. Менавіта гэты бок творчасці беларускай прымы натхніў галоўнага дырыжора Дзяржаўнага камернага аркестра Рэспублікі Беларусь Яўгена Бушкова на стварэнне ўнікальнай праграмы. «Рамансы і танцы» спалучаюць і вакальныя, і інструментальныя рамансы з танцавальнай музыкай.

Сярод кампазітараў — Э. Грыг, С. Рахманінаў, П. Чайкоўскі, І. Брамс, А. Дворжак, Д. Шастаковіч, Д. Попер, І. Альбеніс, І. Штраус, А. П'яцола, а таксама старажытныя рамансы для голасу з акампанементам.

Сёлетні фестываль азнаменаваны яшчэ адной важнай падзеяй. 60 гадоў спаўняецца канцэртнаму аргану філармоніі. У гонар значнай даты 27 красавіка адбудзецца канцэрт Аляксандра Фісейскага. Заслужаны артыст Расіі, прафесар Расійскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага і Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных не ўперышню выступае на беларускай сцэне. У перыяд з 1975 да 1983 года А. У. Фісейскі з'яўляўся салістам-арганістам Беларускай дзяржаўнай філармоніі. У праграме — І. Бах, Ф. Мендэльсон-Бартольдзі, І. Брамс, М. Рэгер.

Вядучая канцэрта — музыказнаўца Вольга Савіцкая. Менавіта яна аўтар шматгадовага праекта «Шэдэўры сусветнага арганнага мастацтва». Пад яе кіраўніцтвам адбудзецца і другі арганны канцэрт фестывалю. 23 мая ў Вялікай зале выступіць народны артыст Расіі і Татарстана Рубін Абдулін. Музыкант з'яўляецца заснавальнікам казанскай арганнай школы, старшынёй Саюза арганістаў Расіі. А рэпертуар яго канцэртных праграм ахоплівае ўсе асноўныя стылі ад эпохі Адражэння да нашых дзён.

Не менш разнастайнай абяцае быць і канцэртная праграма Малой залы імя Р. Шырмы.

Яна ЦЭГЛА

конкурсы

Любоў у юных сэрцах

Як шмат вершаў Максіма Багдановіча прагучала нядаўна ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна ў выкананні навучэнцаў школ, гімназій і іншых навучальных устаноў Беларусі і Расіі на цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў міжнароднага анлайн-конкурсу чытальнікаў «Пад Зоркай Венеры», што адбываўся летась на працягу снежня ў межах абласнога праекта «Пісьменнікі — ураджэнцы роднага краю»!

Генератарам ідэі і галоўным арганізатарам выступіла згаданая кніжніца, а яе партнёрамі сталі Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Выдавецкі дом «Звязда» (газета «Літаратура і мастацтва»), Мінскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, Радыёканал «Культура» і прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Спаборніцтва было прысвечана класіку беларускай літаратуры і мела на мэце прыцягнуць як мага больш людзей да вывучэння яго спадчыны, стымулюваць творчую актыўнасць вучняў школьных і пазашкольных устаноў. Вечна малады паэт шырока адгукнуўся ў сэрцах моладзі: юнакоў, дзяўчат, нават вучняў малодшых класаў успышкай любові, чуласці, эмпатыіі. Усяго было даслана каля 1800 відэаролікаў з запісамі выканання вершаў класіка.

Фота Кастуся Дробава.

Сімвалічныя ўзнагароды.

Многія з работ былі створаны з элементамі тэатралізацыі і пастаноўкі, іншыя — з выкарыстаннем спецыяльных магчымасцей відэамантажу, у некаторых бралі ўдзел не адзін чытальнік, а некалькі, а то і школьны калектыў.

Дасланыя ўдзельнікамі ролікі змяшчаліся на *YouTube*-канале і ў сацыяльных сетках бібліятэкі ў вольным доступе. Сярод сябраў журы, якія ацэньвалі работы з прафесійнага пункта погляду, былі дырэктар бібліятэкі імя А. С. Пушкіна Наталля Вашчыла, старшыня Мінскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Леанід Крыванос, загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Бараноўскі, рэжысёр і мастацкі кіраўнік народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» Алеся Сівохіна. Бадай, усе яны падчас урачыстасці былі аднадушныя ў вызначэнні таго, што стала найскладанейшым у выкананні іх задачы: выбіраць найлепшыя работы сярод мноства не проста добрых, а вельмі добрых і амаль прафесійных, зробленых з вялікай любоўю і майстэрствам.

Праходзіла імпрэза анлайн і афлайн: быў наладжаны тэлемост, праз які да беларускіх удзельнікаў далучыліся пераможцы з Расійскай Федэрацыі. Адметнай музычна-лірычнай аздобай вечарыны сталі выступленні капэлы «Санорус» пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора Вячаслава Ларына, салістаў Белдзяржфілармоніі Уладзіслава Даніловіча і Ганны Янкоўскай і канцэртмайстра Анатоля Цяльцова, а таксама народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» пад кіраўніцтвам Алесі Сівохінай і Алеся Мойскага.

Таша ШПАКОЎСКАЯ

дарэчы

Гармонія душы і прыроды

У літаратурным клубе «Шчырасць» пры бібліятэцы № 22 г. Мінска адбылася музычна-паэтычная вечарына паэтэсы, перакладчыцы, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Надзеі Буранавай. У зале сабраліся пастаянныя сябры клуба, чытачы бібліятэкі, аматары паэтычнага слова.

Надзея Сцяпанаўна нарадзілася ў г. Добруш Гомельскай вобласці. Цяпер жыве ў Мінску. Першыя вершы пачала пісаць яшчэ ў дзяцінстве. У студэнцкія гады стварала шаржы на аднакурснікаў.

Калі ёй было сорак сем гадоў, пайшла з жыцця маці. Гэта было вельмі моцнае ўзрушэнне. І тут як выратаванне сталі прыходзіць вершы.

З'яўляецца аўтарам кніг «Подари мне свой дождь...» (2007), «Аромат времени» (2014), падборка вершаў надрукавана ў Анталогіі сучаснай рускамоўнай паэзіі Беларусі «Поэзия русского слова». Калі з'явіліся ўнукі, пачала пісаць і дзіцячыя творы. Выйшлі кнігі для дзяцей «У бабулі Надзі», «Разговорчики в алфавите, или Вкусная азбука», «Вместе с Вутшиком».

У 2023 годзе пабачылі свет кніга «Солнечный остров» і зборнік выбраных лірычных вершаў «Павлюк Трус: Избранное» ў яе перакладзе на рускую мову.

На вершы «Февраль» («И всё-таки немного жаль...»), «Маяк», «В старом парке», «Не спеши уходить…» створаны песні, якія выконвае бард Анатоль Ушанаў (Расія). Раманс на верш «Случайной нежности обман» (музыка І. Ганчарова) спявае Таццяна Азарава (Расія).

Надзея Сцяпанаўна — пазітыўны чалавек, які лічыць, што паэтычны настрой трымаецца на стаўленні да жыцця, на гармоніі душы і прыроды. Мы бачым свет такім, які ён у нашай душы.

Аляксандра КАРЖАНЕЎСКАЯ

на развітанне

Слуга дабрыні сарамлівы…

5 красавіка 2023 года пайшоў з жыцця паэт, журналіст Павел Вераб'ёў.

«Мы лёс чужы не бралі напракат, // Мы не вымольвалі лацвейшай долі. // І басаногі шлях наш — шлях на волю, // Ніхто не змог аспрэчыць, помні, брат. // Таксама не забудзь, хто нас карміў. // Не збыльняжэюць гэтыя быліны. // І не забудзь, як вецер галасіў, // Калі прыгадваў тое, дзе былі мы», — гэтымі радкамі адкрываецца кніга вершаў, эсэ Паўла Вераб'ёва «Не трэба вас…», выдадзеная ў «Мастацкай літаратуры» у 2005 годзе.

Паэт нарадзіўся 7 лістапада 1958 года на Магілёўшчыне, у вёсцы Рабавічы Слаўгарадскага раёна. Пасля заканчэння школы з 1976 да 1985 года працаваў у слаўгарадскай раённай газеце — карэспандэнтам, загадчыкам аддзела, намеснікам рэдактара. Адначасова ў 1977—1983 гг. завочна вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1985—1987 гг. — слухач Мінскай вышэйшай партыйнай школы. У 1987—1991 гг. — рэдактар аддзела часопіса «Народная гаспадарка Беларусі», загадчык сектара друку ЦК ЛКСМБ, адказны сакратар газеты «Чырвоная змена», намеснік галоўнага рэдактара газеты «Знамя юности». З 1991-га — галоўны рэдактар «Знамя юности». З 1992-га — намеснік галоўнага рэдактара газеты «Добры вечар», з 1994 г. — аглядальнік газеты «Минская праўда». У 1992 годзе прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Першыя вершы надрукаваў у слаўгарадскай раённай газеце ў 1976 годзе.

У 1990 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў зборнік вершаў Паўла Вераб'ёва «Крытычная маса». У 1995-м — другая кніга паэзіі «Цёмнае віно». У 2005 годзе — зборнік вершаў і эсэ «Не трэба вас…». Павел Вераб'ёў — лаўрэат прэміі імя М. Багдановіча выдавецтва «Мастацкая літаратура».

«Сляпы падарожнік ідзе па Айчыне, // Спыніцца не можа — шукае святыню. // Не можа знайсці супакойнага дому, // Патрэбна чамусьці святыня сляпому…» («Жыццё без святыні»). Павел Вераб'ёў пакутліва шукаў галоўныя паэтычныя радкі, якія б праўдзіва расказалі пра час і перажыванні, ацэнкі, звязаныя з пільным агляданнем жыцця. Яго, выдатнага, сумленнага паэта, лёс быў нераздзельны з лёсам Айчыны. Вершы, выпеставаныя яго свядомасцю, — і светлыя, і журботныя, і часам прамалінейна-жорсткія. І гэта зусім не праява мастацкага раскідвання, змены эстэтычных перакананняў. У вонкавай разнастайнасці, шматпланавасці трывалым застаецца галоўны стрыжань паэтычнай сілы Паўла Вераб'ёва: падараваныя ім сучасніку паэтычныя радкі — шчыры, праўдзівы, смелы адбітак жыцця.

Ёсць у паэта верш «Загадка шаравой маланкі»… «Слуга дабрыні сарамлівы // Аднойчы ў адчаі рашыў: // «Пэўна, каб стаць шчаслівым, // Варта пазбыцца душы». // Душу пусціў пехатою, // Сам па свеце пайшоў наўздагад. // Хто палёт твой, душа, супакоіць // І ці вернешся ты назад? // Над сялом, над бацькоўскім дахам, // Над грузам штодзённых турбот // Прамільгнула імклівым птахам // І знікла ў сумётах год. // Адрокся пакутнай ношы, // Ды стала цяжэй — хоць крычы. // І лёсам зрабіўся пошук // Адрынутай птушкі-душы. // Бяссрэбранік, вечны вандроўнік. // Тамленне па свеце вяло. // Маліўся на зоры і поўню — // Прыбіўся ў сваё сяло…» Шчыры служка паэтычнай дабрыні, мастак слова, які многімі сваімі вершамі здзейсніўся як яркая мастацкая асоба, пайшоў у «сваё сяло»… Пайшоў следам за сваімі магілёўскімі суродзічамі — Міхасём Стралцовым, Аляксеем Пысіным, Алесем Пісьмянковым… Ім, сапраўдным паэтам, будзе пра што пагаварыць у «сваім сяле» вечнай Айчыны, вечнага прытулку…

Мікола БЕРЛЕЖ

«ЛіМ»-люстэрка

Фотавыстаўкі пра Беларусь і Расію адкрыліся ў Кішынёве, піша БелТА. Пры падтрымцы пасольстваў Беларусі і Расіі беларуская і руская дыяспары Малдовы арганізавалі тэматычныя фотаэкспазіцыі, прысвечаныя Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. Фотавыстаўка Нацыянальнай бібліятэкі «Беларусь — цудоўныя імгненні» прадстаўлена ў Расійскім цэнтры навукі і культуры. У Беларускім культурным цэнтры адкрылася выстаўка фатаграфій «У аб'ектыве — шматнацыянальная Расія». З нагоды свята пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова перадало ў дар Рускаму дому ў Кішынёве кнігі пра Беларусь. Акрамя таго, была падрыхтавана музычная праграма — народная артыстка Малдовы Маргарыта Івануш выканала вакальныя творы на тэму патрыятызму і любові да сваёй Радзімы. На адкрыцці выставак прысутнічалі прадстаўнікі беларускай і расійскай дыпламатычных місій, нацыянальных дыяспар Беларусі і Расіі ў Малдове, дзеячы культуры.

Новы драматычны тэатр Мінска пакажа спектакль «Я рэч…» на сцэне Кінешэмскага драматычнага тэатра імя А. М. Астроўскага на VI Міжнародным фестывалі рускай класічнай драматургіі «Гарачае сэрца» ў Расіі. Як гаворыцца на сайце ўстановы культуры, фэст працягнецца дзесяць дзён. У яго праграме значацца спектаклі тэатраў «Сфера», «Школа драматычнага мастацтва», Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя У. Маякоўскага і іншых калектываў. Адкрые свята пастаноўка «Жартаўнікі» тэатра «Сатырыкон». Гэта спектакль-парадокс рэжысёра Яўгена Марчэлі.

Мастацкі кіраўнік Мінскага абласнога драматычнага тэатра, лаўрэат дзяржаўных прэмій, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Валерый Анісенка ў пачатку красавіка пачне рэпетыцыі новага спектакля ў Расіі — на сцэне знакамітага Пермскага тэатра «Каля Моста». Для сумеснай працы абрана п'еса Аляксея Дударава «Вечар», гаворыцца на сайце «СБ. Беларусь сегодня». «Тэма каранёў, роду, памяці, вёскі для Беларусі і Расіі агульная, — адзначае заснавальнік і мастацкі кіраўнік тэатра Сяргей Фядотаў. — Па-другое, спектакль будуць іграць на беларускай мове, прычым гэта не адзіная пастаноўка на ім у рэпертуары Пермскага тэатра "Каля Моста": ужо шэсць гадоў з вялікім поспехам у нас ідзе "Камедыя". Такі ход — наша прызнанне ў любові Беларусі».

Кнігу вершаў «Лісты Магамеда» азербайджанскага паэта Магамеда Гаджыева прэзентавалі ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа, паведамляе БелТА. Малады літаратар жыве і працуе ў Беларусі. У зборнік увайшлі новыя вершы аўтара і іх пераклады на беларускую мову Таццянай Сівец, Юліяй Алейчанкай, Міколам Шабовічам. На прэзентацыі прысутнічалі каля 40 чалавек, сярод якіх — аматары мастацкага слова і перакладчыкі. У далейшым паэт плануе займацца перакладам твораў Якуба Коласа і Максіма Багдановіча на азербайджанскую мову, што дазволіць развіваць беларуска-азербайджанскае літаратурнае супрацоўніцтва.

У Маскве аб'явілі конкурсную праграму 45-га Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю (ММКФ). Ён пройдзе з 20 да 27 красавіка, перадае РІА «Новости». Фестываль адкрые вострасюжэтны трылер «Снягір» Барыса Хлебнікава. У асноўным конкурсе пакажуць сіквел меладрамы «14+», «Першае каханне» (Расія), «Нявесту мерцвяка» (Румынія), «Далікатныя кветкі плыні дзён» (Японія) і іншыя стужкі. На перамогу прэтэндуюць карціны з Расіі, Бангладэша, Кітая, Аргенціны, Сербіі і іншых краін. Усяго ў конкурсе заяўлена 12 праектаў. Журы ўзначаліць індыйскі рэжысёр Рахуль Равель («Арджун»). Кампанію яму складуць акцёры Аляксей Гуськоў, Святлана Іванова і Самал Яслямава, а таксама калумбійскі пастаноўшчык Сіра Гера («Абдымкі змея»).

Самы ранні поўны запіс канцэрта *The Beatles* у Вялікабрытаніі 60-гадовай даўніны апублікаваны вяшчальнай карпарацыяй «Бі-бі-сі». Як перадае «ИТАР-ТАСС», яна была зроблена 4 красавіка 1963 года 15-гадовым школьнікам Джонам Блумфілдам падчас выступлення рок-групы ў прыватным інтэрнаце Стоу (графства Бакінгемшыр). Пол Макартні, Рынга Стар, Джон Ленан і Джордж Харысан прыехалі ў навучальную ўстанову па просьбе вучня Дэвіда Мурса, прадстаўніка сям'і бізнесменаў, які напісаў ліст-запрашэнне менеджару ліверпульскай чацвёркі Браяну Эпстайну. Па словах Джона Блумфілда, ён запісаў выступленне на свой новы бабінны магнітафон. Незадоўга да канцэрта ў школе, 22 сакавіка 1963 года, выйшаў дэбютны студыйны альбом *The Beatles* «*Please Please Me*».

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Адзінства думак

На мінулым тыдні Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звярнуўся з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. З гэтай нагоды «ЛіМ» пацікавіўся ў літаратараў, што ўзрушыла і адгукнулася ў сэрцы… Якія з пасылаў Прэзідэнта сталі найбольш блізкімі? Якія з акрэсленых падчас Паслання задач у першую чаргу тычацца пісьменнікаў? Што могуць зрабіць дзеячы культуры для іх вырашэння? На гэтыя пытанні адказваюць айчынныя аўтары.

Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:

— Нельга не пагадзіцца, што адна з галоўных умоў суверэнітэту і незалежнасці — наша адзінства: як нацыя мы павінны змагацца з хцівым «клопатам» заходнікаў пра нас… Салідарны з Прэзідэнтам і ў тым, што менавіта дзякуючы яднанню наш народ выстаяў і перамог у гады Вялікай Айчыннай вайны. Сёння нам неабходна зноў згуртавацца і штодзённай працай даказаць, што Беларусь — мірная і незалежная краіна. Тэма гістарычнай памяці асабліва сугучна маім думкам. Без яе немагчымы мір і стварэнне. Як правільна заўважыў наш лідар, людзі павінны ведаць сваіх герояў, выхоўваць на іх прыкладах моладзь. А ўсе месцы подзвігаў і трагедый беларускага народа павінны стаць месцам паломніцтва і пакланення. Неабходна імкнуцца да таго, каб маладое пакаленне не проста ведала гісторыю сваёй краіны, але і ганарылася ёй.

Што тычыцца акрэсленых падчас Паслання задач, то для пісьменніка важна ўсё! Калі ты — сапраўдны пісьменнік, калі жывеш аднымі думамі і клопатамі са сваім народам… Згуртаванне беларускага народа, умацаванне эканомікі, прапаганда класічных сямейных і культурных каштоўнасцей, патрыятычнае выхаванне моладзі на канкрэтных прыкладах, міжнароднае культурнае супрацоўніцтва з суседзямі і найперш з брацкім нам рускім народам і многае іншае — зыходныя тэмы для творчага пераасэнсавання.

Пісьменнікам застаецца толькі ствараць! Актыўна, самааддана пісаць якасныя творы! Усё, што пералічана вышэй, павінна знаходзіць адлюстраванне ў літаратуры і мастацтве. А яшчэ — больш актыўна папулярызаваць беларускую культуру, родную літаратуру як дома, так і за межамі Беларусі.

Міхась ПАЗНЯКОЎ, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі:

— Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі настолькі змястоўнае, глыбокае і важнае, што заслугоўвае стаць праграмай дзеянняў для кожнага. Гэта і гарачы заклік вядомага палітыка сучаснасці да міру ва ўсім свеце, да супрацоўніцтва, супраць гвалту, несправядлівасці і войнаў. Асабліва ўразіла і кранула тэма суверэннасці і незалежнасці Беларусі. Бо толькі пры такой умове дзяржава можа развівацца, мацнець, мець аўтарытэт у свеце, будаваць шчаслівае жыццё, дабівацца сапраўднай дэмакратыі. Вельмі ўсхвалявалі ацэнкі падзей ва Украіне і рашучая прапанова як мага хутчэй спыніць там усе баявыя дзеянні. Распачаць перагаворы. Нельга, каб братнія народы варагавалі, каб вайна паміж імі знішчала гарады, вёскі, тысячы жыццяў. Нельга, каб радаваліся тыя, хто сутыкнуў ілбамі рускіх і ўкраінцаў, хто нажываецца на крывавых бойнях. Як і нельга дапусціць адраджэння фашызму і бандэраўшчыны. Нельга і пагражаць нам, прасоўваючы войскі НАТА да межаў Саюзнай дзяржавы.

Мяркую, што, як і мне, так і нашым пісьменнікам, дзеячам культуры, кожнаму патрыёту вельмі імпануе пасыл Прэзідэнта Беларусі аб народным яднанні і ўроках 2020 года. Я з выключным спадзевам успрыняў яго меркаванні аб знешняй палітыцы ў новых умовах. У самых шырокіх стасунках з братняй Расіяй, ва ўмацаванні нашай Саюзнай дзяржавы, у сяброўстве і супрацоўніцтве з Кітаем, Індыяй, многімі іншымі пазітыўным краінамі — наша моц і шчаслівая будучыня. Вельмі парадавалі мяне, упэўнены, і многіх маіх калег, роздумы Кіраўніка дзяржавы аб гістарычнай памяці і нацыянальных традыцыях, аб абароне нацыянальнай спадчыны, аб сацыяльнай справядлівасці, аб культурным імпартазамяшчэнні. Мы ўзбагачаемся найлепшымі здабыткамі сусветнай культуры і самі ўзбагачаем яе сваімі цудоўнымі ўзорамі. Імі мы і цікавыя ўсяму свету. Нам ёсць што развіваць і чым ганарыцца.

Сёння ад нас, пісьменнікаў, таксама залежыць многае, каб у грамадстве панавалі згода, адданасць Радзіме і народу, нястомная праца, імкненне да высокіх вызначаных мэт. Наша пісьменніцкая арганізацыя шмат робіць дзеля гэтага. Ствараюцца кнігі, вартыя нашага часу, пашыраецца супрацоўніцтва са шматлікімі замежнымі калегамі, ідзе актыўная работа з творчай моладдзю. Мы сеем разумнае, добрае, вечнае. Імкнёмся выхоўваць сапраўдных патрыётаў. І ўсю нашу творчую і культурна-асветніцкую працу абавязаны працягваць больш упэўнена, мэтанакіравана, актыўна і паспяхова.

Алесь КАЗЕКА, старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:

— Лічу, што годна жыць і развівацца ў сучасным свеце дзяржава здолее, калі яна мудра і ўсебакова ўлічвае і пралічвае ўсе складнікі, прагназуючы наступны крок. Таму ўспрымаю Пасланне нашага Прэзідэнта як цэльную гарманічную канструкцыю, у якой кожны пасыл выконвае сваю адметную ролю ў фарміраванні эфектыўнасці цэлага. Гэта як ставіць пытанне: якая шасцярэнька ў гадзінніку найбольш важная? Мы ж гэтага не робім. Так і тут.

Як кажа народны пісьменнік Беларусі Мікалай Чаргінец: сучаснага пісьменніка павінны тычыцца ўсе кірункі дзейнасці грамадства. Без гэтага адзінства, без гэтай датычнасці наўрад ці здолееш напісаць нешта сапраўднае, нешта вартае. У больш вузкім сэнсе лічу, што сучасны пісьменнік — гэта ідэолаг, нават святар, а сапраўдныя творы — адкрыцці, пропаведзі, якія накіраваны на выхаванне сапраўдных духоўных якасцей, узвышэнне ідэй міру і любові, выхаванне Чалавека і грамадзяніна. З гэтага пункту гледжання выразна відаць і тыя акрэсленыя ў Пасланні задачы, якія тычацца пісьменнікаў.

Што могуць зрабіць дзеячы культуры для іх вырашэння? Гэтае пытанне вартае вялікага артыкула… І не аднаго. Не буду пералічваць тут кірункі, спосабы і метады… Яны шматлікія і відавочныя амаль кожнаму. Скажу некалькі слоў пра іншае. У сучасным свеце ідзе непрымірымая, жорсткая вайна не толькі на фізічным, але і на духоўным узроўні. Вайна паміж цемрай і святлом. Вайна, у якой няма паняцця нейтралітэту. Таму, галоўнае, кожнаму дзеячу культуры, кожнаму творцу неабходна вызначыцца: з кім ты? На чыім ты баку? І калі ёсць няўпэўненасць у выбраным кірунку, сыдзі з гэтага шляху, не разбурай душы людскія, бо сваю згубіш. А калі выбраў шлях ваяра святла — ідзі разам з народам сваім, разам з дзяржавай сваёй і «сэрцам асвятляй дарогу людзям».

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ, старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:

— У сваім выступленні Прэзідэнт абазначыў галоўныя ўмовы захавання суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны, сярод якіх — умацаванне духоўных і маральных асноў, прапаганда сямейных каштоўнасцей і ўвага да гістарычнай памяці.

Калі інфармацыйныя плыні набіраюць абароты, уплываюць на свядомасць людзей, трэба памятаць, што мастацкае слова — магутная зброя супраць абыякавасці, памылковых меркаванняў, неабдуманых учынкаў. Таму ў пісьменнікаў вельмі важная місія: праз сваю творчасць, праз літаратурныя набыткі папярэднікаў падвесці чытача да жадання духоўна расці, з цікавасцю і пашанай вывучаць лёсы сваіх продкаў, іх традыцыі, тым самым падыходзячы да вывучэння роднай гісторыі, культуры. Падчас урокаў мужнасці, урокаў памяці, літаратурна-краязнаўчых экспедыцый пісьменнікі дзеляцца з рознымі аўдыторыямі сваімі разважаннямі, меркаваннямі наконт жыцця сучаснай Беларусі, жыццёвымі высновамі і перакананнямі. І менавіта ў такія хвіліны эмацыянальнага ўзлёту, шчырых размоў і здараецца ўзаемапаразуменне, адзінства думак. Сёння вялікая адказнасць перад маленькімі чытачамі і ў дзіцячых пісьменнікаў. Уменне прыслухоўвацца да дарослых, браць з іх прыклад, бачыць сэрцам прыгожае ў навакольлі і ў людзях — вельмі важныя якасці, якія ў дарослым жыцці дапамогуць быць заўсёды на баку справядлівасці.

Задача ў пісьменнікаў і сёння, і заўтра адна — тварыць, сустракацца з чытачамі, асабліва з моладдзю. Праца пісьменніка, як і праца настаўніка, не мае імгненных вынікаў, але часам зусім не заўважна для самога чытача мы дапамагаем яму прыняць правільныя рашэнні, натхняем на штодзённую стваральную працу на карысць сваёй Радзімы, абуджаем самыя пяшчотныя пачуцці да роднага кутка і людзей, якія заўсёды побач.

Анатоль АЎРУЦІН, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, уладальнік «Залатога Віцязя-2022» у галіне паэзіі:

— Усе чатыры з паловай гадзіны я не адыходзіў ад экрана. Амаль кожная фраза Прэзідэнта выклікала сустрэчныя эмоцыі. Падзеі ва Украіне, слушныя ініцыятывы аб тым, як спыніць гэты жах… Зараз склалася такая сітуацыя, калі ніводны з бакоў не можа першым згадзіцца на перагаворы — гэта палічаць слабасцю. Таму менавіта наш Прэзідэнт — самая падыходзячая асоба для гэтай мэты. Ён кіруе краінай, якая, як ніхто іншы, зацікаўлена ў тым, каб побач з нашымі межамі не грымелі выбухі і не гінулі людзі. І ўсе мы хочам спынення вайны, прытым разумеючы, што ў выпадку паражэння Расіі з карты свету можа знікнуць і тая Беларусь, у якой мы цяпер жывём…

Прэзідэнт вельмі слушна заўважыў, што сапраўднага патрыёта здольны выхаваць толькі патрыёт. Вось дзе вялікая прастора для літаратара. Слова пісьменніка і цяпер, будзем шчырымі, выглядае больш важкім, чым слова не толькі звычайнага суразмоўцы, — яно часам пераважае і тое, што здольны сказаць чыноўнік дастаткова высокага рангу, які нічога значнага не зрабіў. Ад пісьменніка сёння патрабуецца актыўна ўдзельнічаць у выхаванні ў чытачоў пацуцця сапраўднага патрыятызму. Якраз з творамі такой тэматыкі ў нас шмат праблем. Многія майстры слова знарок адыходзяць ад паўсядзённасці, амаль не хаваючыся, разважаюць аб тым, што, маўляў, невядома яшчэ, як усё павернецца і што нас чакае наперадзе…

Але сапраўдны творца — заўсёды крыху прарок. Калі б чалавецтва больш слухала сваіх пісьменнікаў, многіх бед можна было б пазбегнуць… Але недахоп увагі з боку грамадства, які зараз няцяжка заўважыць, не павінен неяк адмоўна ўздзейнічаць на духоўны складнік творчасці. Празаікі і паэты толькі тады вернуць айчыннай культуры належную зацікаўленасць здаровага грамадства, калі кожны на сваім месцы зробіць тое, што абавязкова прыцягне да сябе ўвагу — напіша аповесць, намалюе карціну, створыць песню, якую заспяваюць… Самае шкоднае для творцы — маўчаць, рабіць выгляд, што нічога не адбываецца…

Алена БАСІКІРСКАЯ, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, журналіст Выдавецкага дома «Беларусь сегодня»:

— Пасланне Прэзідэнта да народа і Нацыянальнага сходу яркае, змястоўнае, эмацыянальнае. Для мяне вельмі важны і блізкі пасыл аб захаванні гістарычнай памяці і нашых нацыянальных традыцый. Адгукнуліся словы Кіраўніка краіны аб тым, што трэба актыўней прапагандаваць свае традыцыі і сімвалы, айчынных артыстаў і мастакоў… У гэтым шэрагу маюцца на ўвазе і пісьменнікі, родная літаратура. Попыт на айчыннае расце, а значыць, запатрабаваны і кнігі нашых аўтараў — цікавыя, адметныя, высокамастацкія, разнажанравыя. Таму пацвярджэннем — Міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, якая нядаўна адбылася ў Мінску. Расце цікавасць да нашага кніжнага свята з боку замежных краін, сёлета іх прыехала 19. Нядзіўна: Беларусь хоць краіна і невялікая, але таленавітая, паказвае прыклад і ў кнігавыданні. Дарэчы, толькі за 2022 год у нас выпушчана 8586 найменняў кніг і брашур агульным тыражом 20,13 мільёна экзэмпляраў. Прычым уражвае не толькі колькасць, але і змест. Гэтыя выданні вельмі актуальныя, адпавядаюць запатрабаванням часу. Варта прыгадаць, напрыклад, серыю «Генацыд беларускага народа» — сумесную работу Генпракуратуры і выдавецтваў, альбом «Адзінства непераможнага народа», выданне «Дзень народнага адзінства», прысвечанае ўз'яднанню Усходняй і Заходняй Беларусі. Міністэрства інфармацыі, Саюз пісьменнікаў Беларусі, айчынныя выдавецтвы клапоцяцца аб прапагандзе сучаснай літаратуры, факсімільным аднаўленні старажытных рарытэтаў, захаванні і ўзбагачэнні кніжнай спадчыны. У наш няпросты час такія захады асабліва важныя.

Яго шмат чыталі, добра ведалі, але аб ім амаль зусім не пісалі, ды сам ён як быццам гэтага не заўважаў. Аднак жа зважаў, не мог не зважаць на замоўчванне, бо ведаў сабе цану. А хто яшчэ мог аспрэчваць яго першынство ў сатырычным і гумарыстычным спаборніцтве? Хоць якое там спаборніцтва! Сатыра, як сцвярджалі тады, была зброяй у руках партыі. А іх, самых дзейсных стралкоў яе, было некалькі на ўсю літаратуру, якая пасля вайны толькі пачынала гуртаваць свае парадзелыя рады.

У згодзе байкі і санета

Эдуард Валасевіч у Мінску з'явіўся толькі ў 1952 годзе. У высокім чарнявым мужчыне, што надта звыкла апіраўся на кавеньку, лёгка было пазнаць нядаўняга франтавіка. Сярод яго новых знаёмых, з якімі адразу ж завязалася моцнае сяброўства, таксама былі ўсе тыя, хто прайшоў дарогамі вайны. І іх размовы ніколі не абміналі нядаўніх падзей, хоць кожнага больш ужо цікавілі тэмы літаратурныя. Многія мелі свае кнігі, нават па некалькі. Яго ж першы зборнік «Вершы і байкі» выйдзе толькі праз два гады. Але ў Саюз пісьменнікаў уступіў яшчэ ў 1950 годзе.

Нарадзіўся ў 1918-м у Магілёве. Хоць бацькі, Станіслаў Тамашавіч і Міхаліна Марцінаўна, паходзяць з Беласточчыны, у горадзе на Дняпры апынуліся ў сувязі з вайной. Бацьку працоўны лёс звязаў з чыгункай. Думаў, што і сын пойдзе тым жа шляхам. Ён нават вучыўся ў чыгуначнай сямігодцы. Але калі ў 1935-м памёр бацька, не раздумваючы, пайшоў грузчыкам на чыгунку. У наступным годзе паступіў на рабфак Магілёўскага педінстытута. Так вырашыў яшчэ ў сямігодцы. Не ведаў бацька і ўжо ніколі не даведаецца, што сын жыў яшчэ адным, самым патаемным жаданнем: яго клікала ў свае абдымкі паэзія. Ужо ў 1937 годзе прозвішча Эдуарда Валасевіча мільгала пад допісамі ў газеце «Камунар Магілёўшчыны». У наступным годзе з'явіліся і першыя вершы. Гэта і змусіла перавесціся на літаратурны факультэт педінстытута, які скончыў у 1941 годзе.

Добраахвотна ўступіў у Першы камуністычны знішчальны батальён. Ваяваў у дзеючай арміі на Бранскім і Заходнім франтах. У 1943 годзе цяжка параніла. Пасля доўгага лячэння дэмабілізаваўся інвалідам Айчыннай вайны. Працаваў старшым навуковым супрацоўнікам Дзяржаўнага архіва Аджарскай ССР у Батумі. Вучыўся наноў хадзіць і марыў некалі вярнуцца да толькі што перажытага, якое магло стацца і зусім безвыходным. Яно само прасілася на паперу, змушала да нейкай незвычайнай споведзі, а ён адчуваў, што не гатовы яшчэ да яе. У жанры, на якім спыніў свой выбар, у байцы, таго, вядома ж, сказаць немагчыма. Эзопава досціпу замала — патрэбна хутчэй за ўсё бачанне і пакутлівае цярпенне празаіка. Пісаў і друкаваў нарысы і часам усё яшчэ верыў, як і яго калегі, што аднойчы перажытае суне ў руку асадку з чарнілам і скажа: «Пішы, час прыйшоў». Але жыццё распарадзілася па-іншаму. Пісаць змусіла не прозу, а санеты. Многія з нас былі здзіўлены тады, калі ўбачылі ў чарговым «Дні паэзіі» яго санеты. Дзіўнае было ў тым, што іх пачаў пісаць закаранелы байкар. А ён толькі ўсміхаўся сваёй вядомай усмешкай, нібыта казаў: «Пачакайце! Хутка прывыкнеце!» Так яно і здарылася. Але тут я сам сябе апярэдзіў. Павінен спыніцца на тым, як сцвярджаў у сабе, упартым ды настойлівым, таго самага байкара.

Байкі пачаў пісаць не адразу. У 1944 годзе пакінуў Батумі і вярнуўся ў Магілёў. У педінстытуце выкладаў фальклор і рускую літаратуру. Аднак затрымаўся ненадоўга, неўзабаве ўжо загадваў аддзелам у абласной газеце «За Радзіму». Выступаў не толькі з нарысамі і вершамі, замалёўкамі і фельетонамі. 22 мая 1945 года газета змяшчае яго артыкул «Вобраз маладога чалавека ў савецкай літаратуры», а ўжо 3 чэрвеня друкуецца апавяданне «Насустрач сонцу». У наступным годзе пачнуць друкаваць і яго байкі. Меркаваў аўтар, што сатыра будзе толькі часовым захапленнем, але ўсё нібыта вырашылі чытачы.

— Не магу патлумачыць, за што я спадабаўся чытачу, — прызнаўся мне неяк. — Пачалі закідваць водгукамі, за вочы ледзь не падкідаючы ўгору. І я павінен быў апраўдваць давер.

Былі даспадобы задзірыста-прыжмуравокія, надта трапныя назіранні і ўражанні чалавека, які вельмі лёгка апранае сваіх герояў у вопратку звяроў і птушак, а потым садзіць іх за канцылярскія сталы, дае ў рукі кіраўнічае начынне. Трэба ж умець адсачыць і паказаць чытачу таго, хто жыве з ім побач, ходзіць аднымі сцяжынамі, есць ледзь не з адной міскі, а падрабліваецца і маскіруецца заўсёды пад іншага, а часам гатовы з'есці і цябе самога, калі пашанцуе з апетытам і спрыяльнымі абставінамі.

Служба смеху такая: у яе свой вышук, свая служба пільнасці, свая мера пакарання, ці, мякка кажучы, высмейвання. Усё гэта толькі потым зразумеў. А яшчэ — што аўтару, які бярэ ў свае рукі эзопаўскую зброю, патрэбна смеласць. Лірык можа абысціся і без яе — яму дастаткова чуллівасці ды пяшчоты. А сатырыку, бывае, бракуе звычайнага гневу. Не пашкодзіць і не затушуе яго алегарычнага бляску і філасофскі падтэкст. Само жыццё і самі настойлівыя пошукі сродкаў выразнасці пераконвалі яго ў гэтым. Запэўніваў нават матыль з самай кароценькай ранняй байкі, што мела тую ж назву:

Матыль з начы на вогнішча ляцеў,
А даляцеўшы — ён згарэў.
— Ну і дзівак! На што ён спадзяваўся?
Дзеля чаго ў агонь так рваўся?
Ці ж ён за праўду быў змагар? —
Зласліва празвінеў Камар, —
Блазнота!
Лепш змрок і зыбкае балота…
А я —
За матыля!

Ёсць у Эдуарда Валасевіча байка «Калаўрот», якая, магчыма, і не надта заўважана чытачом, але для яго самога была нібыта творчым арыенцірам. У сваіх пошуках потым увесь час згадваў яе. Размова ж у байцы ідзе пра нейкае мізэрнае адкрыццё, якое і яйка выедзенага не варта, але пра якое крычаць так, нібыта гэта вынаходства веку. Прыкладаў такіх «адкрыццяў» у жыцці колькі хочаш! Тэма, як кажуць, не свежая, не новая, ды і ўвасабленне яе не надта свежае. Чым жа тады гэты твор стаў адметны для аўтара? Ды, мабыць, самой падказкай, што і байкар-сатырык павінен пачувацца нейкім калаўротам, не перастаючы круціцца ў прагным віры жыцця.

Тры вядучыя байкары Беларусі — Кандрат Крапіва, Уладзімір Корбан і Эдуард Валасевіч — не спрачаліся між сабой, чые мядзведзі, ваўкі і зайцы лепшыя, а ў таемным спаборніцтве паўтараў і драбнатэм'я пазбягалі і баяліся. Калі чытач у гэтым сэнсе заўважаў не ўсё, дык крытыкі былі пільныя, асабліва маладзейшыя. Вунь як выстраліў артыкул маладога Анатоля Клышкі «За мухай з абухам». Цяжка было і з пошукам імёнаў сваіх герояў. Усё гэта разумеў аўтар «Калаўрота». Перачытваючы сёння яго байкі, сярод герояў сустракаеш і многія рэчы, дрэвы, музычныя інструменты, тыя ж валуны… Ён шукаў!

Напачатку ўзнікаў пазнавальны партрэт аднаго з творцаў. Выкарыстоўваліся нават яго нейкія вартыя пародыі радкі, і тут, як з негатыва, узнікаў сапраўдны пазітыўны твар героя. Некалі, чытаючы байку «Хамсіст», многія пазнавалі і твар самога творцы, пазнавалі і яго радкі:

Сталічны Пісарчук,
Цыбаты і падгалы,
Прынёс у друк
Аднойчы мадрыгалы:
«У мяне жаданне і ў цябе жаданне…
А як скласці разам —
будзе ў нас каханне!»
Рэдактар прачытаў і пырснуў смехам:
— Бач, адшукаўся Дант!
Ну і пацеха…
Ты ж сам, здаецца, кансультант?..

Сэнс байкі ў тым, што героя-аўтара ў яго творчай працы цікавіў толькі нейкі заробак. І, зразумеўшы, што прыбытку ў яго творчых стараннях чакаць дарэмна, падаўся вырошчваць бульбу. З вёскі вёз у горад на продаж, а назад прыязджаў з бочачкай хамсы. Як на сёння, дык можна б і пахваліць такое зручнае прадпрымальніцтва. Але ў аўтара была зусім іншая задача.

Думаю, няма патрэбы тлумачыць, у чым соль аўтарскай задумы. Хай байка недзе і прайграла ў часе, але партрэт героя надта дакладны. І радкі мадрыгала, якія Эдуард Валасевіч прыводзіць у пачатку вершавання, я неаднойчы чуў у літаратурных кулуарах, пад агульны смех, як парадыйныя. Казалі, чытаючы іх са сцэны, прыгінаўся, бо меў высокі, гоністы рост, і, тыцкаючы рукой у кагосьці з прыгожых жанчын, выпальваў: «У мяне жаданне і ў цябе жаданне…» І жанчына, спалоханая, падхоплівалася і пакідала залу. Мастацкі прыём такога роду быў бяспройгрышны.

Спасылаючыся не толькі на эзопаўскую мудрасць і мову, пільна вывучаючы вопыт Лафантэна, Лесінга і Крылова, настойліва выпрацоўваў сваю методыку сатырычнай выразнасці, надаючы байцы гутарковай народнай вобразнасці і непасрэднасці, выкарыстоўваючы пры гэтым і штрыхі самога малюнка, і алегарычны падтэкст. Яго байкі гучалі не толькі на самадзейных сцэнах — часта іх выконвалі і вядомыя артысты. Памятаю, неяк невялічкім пісьменніцкім гуртом выступалі ў вясковым клубе на Астравеччыне. Вечарам, стомленыя дзённай працай, слухачы прасілі чытаць пабольш гумару. А мы, выступоўцы, амаль усе лірыкі. І тут на сцэну выбягае, менавіта выбягае, сярэдніх гадоў высокі і прыемны мужчына ды пачынае чытаць без ніякай прадмовы самую вядомую байку Эдуарда Валасевіча «Хама». Прымаюць яго шумнымі воплескамі, выгукам і дружным смехам…

— А байка чыя, ведаеце? — запытаўся хтосьці з нас.

— Ды не, — прызнаўся той. — Перапісаў у аднаго знаёмага.

Давялося згадаць прозвішча нашага вядомага байкара. І доўга яшчэ ў яго адрас гучалі апладысменты, а, пакідаючы залу, некаторыя цытавалі самі сабе канцоўку з «Хамы»:

Так жонцы дагаджаць Хама стараўся
Да той пары, пакуль сам не папаўся.
А жонка як? З ім села у турму?
Яна шукае новага Хаму.



Эдуард Валасевіч.

Напэўна, не толькі я — шмат хто з нас, знаёмячыся з творамі сатырыкаў ды гумарыстаў, хто не бачыў на свае вочы іх саміх, уяўляюць дужа ўсмешлівымі, дужа няўседлівымі, нават задзірыстымі. Тое, што гэта не так, я зразумеў, калі ўпершыню пабачыў Кандрата Крапіву. Твар сатырыка, чые творы змушалі смяяцца да ўпаду, здалося, не памятаў ніводнай усмешкі. Гэтага не скажаш пра Эдуарда Станіслававіча. Прырода так вымудравала яму вусны, што, здавалася, з іх не сыходзіла ўсмешка нават у час смутку ці роздуму. Ён, пэўна, і нарадзіўся з ёю. Вусны акругляліся, калі размаўляў ды ўсміхаўся, і нагадвалі каўток добрага моцнага напою. Вусны былі трубачкай. Застаўся на нейкім фотаздымку і яго твар з кароценькімі вусамі і цёмнай лёгкай бародкай. Сябры жартавалі: «Бародка ў Эдзіка — ад байкі, а вусы — ад санета».

Праўда, не суніміліся скептыкі: «Калі байкар пачынае пісаць санеты, дык добрага чакаць не варта». Аднак строгі і разважлівы Кандрат Крапіва ў сваёй прадмове да кнігі выбранага Эдуарда Валасевіча "Лірыка і сатыра" (1988) сказаў так: «Юбілейная кніга паэзіі беларускага байкара Эдуарда Валасевіча "Лірыка і сатыра" (паэт сустракаў сваё сямідзесяцігоддзе. **— К. К.**) адкрываецца санетамі. Чытач, які звык мець справу з сатырычнымі творамі гэтага аўтара, мабыць, крыху здзівіцца з нагоды такой метамарфозы. Але ж, на маю думку, нічога нечаканага тут няма. У байкара ж таксама жывая, пяшчотная душа, і, пры пэўных абставінах і перыпетыях, скажам, — квітнеючая вясна або залатая восень — душа байкара напаўняецца лірычнымі мелодыямі і, натуральна, спявае!

З гісторыі літаратуры мы ведаем, што пераважная большасць лірыкаў звярталася час ад часу да сатыры. І, наадварот, многія сатырыкі спявалі элегіі і серэнады».

А Рыгор Барадулін у сваіх біяграфічных нататках «На таку майго веку» згадвае, як на пасяджэннях літаб'яднання пры «Чырвонай змене» ў 1950-я гады «байкар Эдуард Валасевіч расказваў пра санет».

З Эдуардам Станіслававічам я пазнаёміўся і пасябраваў, калі працаваў на Рэспубліканскім радыё. Ён узначальваў Беларускае аддзяленне Усесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах СП СССР. Разам са сваім бухгалтарам туліўся ў цеснаватым пакойчыку у засценні часопіса «Нёман». У пакоі амаль заўсёды было людна, бо заходзілі сюды не толькі творцы ад літаратуры, але і люд тэатральны. Часта сустрэчы набывалі і чыста размоўны характар і працягваліся ў пакоях «Нёмана».

Калі выйшаў на пенсію, нярэдка сустракаліся ў яго дома. Мог патэлефанаваць яшчэ з ранку і сваім вясёлым голасам прапанаваць: «Гатую смачны абед, так што прашу да мяне!» І збіралася на кухні цэлая сябрына. Ведаў цану сяброўству і сяброў выбіраў не толькі па ўзросце ды чыне. Прыцягваў сваёй простасцю, шчырасцю і адкрытасцю. Такім жа заставаўся і ў творчасці. Напісана і выдадзена ім шмат. Нават таго, што я маю ў сваёй бібліятэцы з яго аўтографамі, мнагавата для пераліку. Гэта і «Казёл адпушчэння», і «Рак з кляшнёй», і «Рагаты анёл», і «Полюсы», і «Кругавая парука». У яго творчым набытку ёсць кнігі і для дзяцей, а таксама творы драматургіі, а яшчэ шматлікія пераклады. І ўсё ж жанр байкі пераважае. Яму прысвяціў усё сваё творчае жыццё. Шмат якія творы сталі народнымі. Які б век ні прарочылі самой байцы, бясспрэчным застаецца адно: усё таленавітае, у якога ёсць жыццёвая аснова, будзе запатрабаваным. У любым часе!

Казімір КАМЕЙША

Чаму мы часта цешымся лухтой?
А вершы — галавешкамі ачахлымі.
Гляджу на воблакі —
І слёзы на вачах маіх,
І добра, што не бачыць іх ніхто.
Пімен Панчанка

Ці можа састарэць паэзія

«Не! — катэгарычна адкажа большасць паэтаў. — Паэзія не можа састарэць! Паэзія — вечная! Людзі заўсёды будуць пісаць вершы і заўсёды будуць іх чытаць!» З гэтым, мабыць, можна пагадзіцца. Паэзія як жанр, вершы як з'ява — усё гэта не страціла сваёй каштоўнасці і ў інфармацыйным XXI стагоддзі. Інтэрнэт-паблікі поўняцца вершамі паэтаў-пачаткоўцаў і сталых аўтараў. Праводзяцца паэтычныя конкурсы і фестывалі. Дык пра што ж тады гаворка?

Пра верш як прадукт сваёй эпохі. Пра тэксты, што ствараюцца канкрэтнымі аўтарамі. Ці можа састарэць паэзія якога-небудзь часу, ці могуць выглядаць для нас не новымі, не арыгінальнымі канкрэтныя тэксты?

Зноў не, — усклікне аптымістычна настроены творца. Бо паэзія — гэта ж вечнае, нязменнае. І класічная паэзія будзе існаваць заўсёды, колькі б Маякоўскіх ні прапаноўвала скінуць класікаў з парахода сучаснасці. Заўсёды будуць і рытм, і рыфма, і вечныя тэмы, на якія хочацца гаварыць вершамі, і мастацкія прыёмы, і…

І ўсё гэта ***можа*** састарэць, — кіўну я. Інакш чаму б у часы спадара Пушкіна смяяліся з графа Хвастова з яго невынішчальнай любоўю да стараславянізмаў? З-за чаго б такія парадысты, як «кароль рускай рыфмы» Д. Д. Мінаеў здзекаваліся з паэтаў, якія пераймалі манеру Фета? Чаму Гумілёў называў паслядоўніц Ахматавай, якія пісалі ў яе стылі, «падахматаўкамі»?

Вядома, можна сказаць, што справа ў перайманнях, якія плодзяць мноства падобных твораў. Ці справа ў мове — бо яна ж развіваецца, узбагачаецца новымі словамі — і паэту міжволі даводзіцца прыстасоўвацца...

Але тады чаму ж мы не так часта пішам чатырохстопным ямбам, пазбягаючы «пушкінскай мелодыкі»? Чаму не лічацца зараз добрымі рыфмамі «Беларусь — ганарусь», «каханне — расстанне»? З-за чаго дрэннай манерай лічыцца дзеяслоўная рыфма, якой на ўсю моц карысталіся і Пушкін, і Колас, і Купала? Адкуль узялося паняцце «сцёртай» метафары?

Атрымліваецца, што састарэць можа не толькі мова твораў. І развіваецца далёка не толькі мова. **Састарэць могуць і рытм, і рыфма, і мастацкія прыёмы.** Як і мова, паэзія чужая аднастайнасці, як і мова, яна развіваецца, але робіць гэта па сваіх законах. Паэзія выкарыстоўвае пераемнасць: напрацоўкі папярэдніх пакаленняў паэтаў кладуцца ў аснову творчасці паэтаў будучых. Але адначасова паэзія заўсёды спрабуе дасягнуць чагосьці новага, пашырыць уласныя межы.

Менавіта імкненнем паэзіі да ўнікальнасці тлумачыцца ўвесь бунт Сярэбранага веку літаратуры з яго сімвалізмам, футурызмам, акмеізмам і іншымі «-ізмамі». Бунт гэты там-сям прымаў адкрыта выродлівыя формы, але здолеў зрабіць галоўнае — зрушыць «застылую» на адным месцы класічную паэзію, прыўнесці ў яе і новыя тэмы, і новыя спосабы іх паказу.

На плечы атлантам Сярэбранага веку паэзіі, кажучы алегарычна, сталі паэты веку Бронзавага: у вершах Роберта Раждественскага загучалі прыёмы Маякоўскага, а ў тэкстах Бэлы Ахмадулінай можна пачуць матывы Ахматавай і Цвятаевай. Але шасцідзясятнікі здолелі прыўнесці ў літаратурны працэс цікавыя мастацкія прыёмы, адкрылі для чытача безліч новых тэм. Паэзія шасцідзясятнікаў і іх паслядоўнікаў адгукнулася і ў беларускай літаратуры — тут і інтанацыйныя эксперыменты Пімена Панчанкі, і работа з формай (да верлібраў і хайку!) у Максіма Танка… І вось на плечы гэтых аўтараў і іх паслядоўнікаў павінны цяпер абаперціся ўжо мы. Аднак паэзія на старонках перыядычных выданняў і ў новых паэтычных зборніках куды часцей адсылае нас да матываў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Тэматычна гэта «матчына хата», «мова», «вайна», развагі аб прыродзе, Радзіме і сэнсе жыцця. З тэхнічнага боку — класічныя, праверaныя, гадамі апрабаваныя метры, рыфмы і вобразы.

Ці дрэнна звяртацца да знаёмых тэм і вобразаў, такіх, як бег ручаёў, буслы і жоравы, зубры і журавіны, ільны і белыя аблокі? **Пазнавальнасць не робіць вобраз састарэлым — але ж яна патрабуе ад паэта большай увагі для ўвасаблення яго ў вершах**. Інакш кажучы, калі ты не ўзяў новую тэму, не разгледзеў нейкую новую грань — у тваім творы ўсё роўна павінна быць нешта ўнікальнае, незвычайнае. Новыя гэта рыфмы, ці новыя метафары і эпітэты, ці новая інтанацыйная структура — усё роўна (але лепш — каб усё разам).

Менавіта гэтага і не хапае часам не толькі сталым паэтам, але і маладым. **Звяртаючыся да вядомых вобразаў — яны звяртаюцца яшчэ і да вядомых мастацкіх прыёмаў.** Пра тыя самыя праблемы кажуць тымі ж словамі, што век таму былі ўжо прамоўлены іншымі творцамі.

Таму сучасная паэзія часам пачынае здавацца... звыклай. Звычайнай. Знаёмай. Састарэлай.

Тут трэба б паставіць шмат клічнікаў, бо састарэлай здаецца тая самая паэзія, якая павінна б быць самай што ні на ёсць новай і дзіўнай для чытача. Якая павінна хоць трохі — але рассоўваць межы, хоць трохі — але знаходзіць баланс паміж класікай і інавацыяй. Замест гэтага шматлікія ўзоры сучаснай паэзіі імкліва «прасядаюць» па ўзроўні і знаходзяцца на часавай шкале дзесьці далёка *перад* узорамі Максіма Танка і Пімена Панчанкі, на плячах якіх гэтая лірыка павінна б стаяць…

Я не называю прозвішчаў і не прыводжу цытат. Па-першае, таму што не хачу пакрыўдзіць як старэйшых таварышаў, так і аднагодкаў ці аўтараў-пачаткоўцаў (так, часам і крытыкі могуць быць чуллівымі). Па-другое, несправядліва было б паказаць на адных і забыцца на іншых, калі з'ява настолькі распаўсюджаная. Аднак Вы, мой патрабавальны чытач, — няўжо Вы ніколі не закрывалі паэтычны зборнік, часопіс або літаратурны альманах з выразнай думкай: «Я гэта ўжо чытаў і, магчыма, некалькі разоў?»

Можа быць, не трэба біць у набат, паколькі мае месца распаўсюджаны мастацкі прыём — зварот да яснай, злёгку нават народнай паэзіі, які практыкавалі і Аляксандр Твардоўскі, і паэты Вялікай Айчыннай вайны, і прадстаўнікі «ціхай лірыкі» (напрыклад, Мікалай Рубцоў) у 60-я гады і пазней?

Але калі паспрабуем параўнаць з чымнебудзь «Васілія Цёркіна» — мы не знойдзем падобных літаратурных узораў. Менавіта ўнікальнасць зрабіла гэтую паэму такой вядомай і вырвала хвалу ёй нават з вуснаў Буніна, які наогул рэдка хваліў чужую творчасць. Тое ж самае можна сказаць пра тэмы і прыёмы ў лірыцы Рубцова, ды і ў ваеннай лірыцы Сіманава, Ісакоўскага... Яны былі ў сваёй плыні — так, але адначасова пісалі **нешта, што раней ніколі не ствaралася**. Ці могуць такое пра сябе сказаць сучасныя беларускія аўтары?

На жаль, не ўсе. І прычына, як ні дзіўна, збольшага хаваецца ў школьнай адукацыі. Школьная праграма занадта імкнецца паказаць «адкуль наша паэзія пайшла» — і ў выніку фарміруе ў свядомасці вучняў не зусім правільныя паняцці аб літаратурным працэсе і яго развіцці. Знаёмячы з асновамі, яна не паказвае, да чаго гэтыя асновы прывялі. Паказваючы вытокі нашай паэзіі, амаль не адзначае, да якіх стандартаў яна прыйшла цяпер. Колькі часу ў школе адводзіцца на вывучэнне Пушкіна і Лермантава, Фета і Цютчава? А колькі — на Маякоўскага і Ясеніна? А на Высоцкага? Еўтушэнку?

Гэта велізарны перакос — і па часе чытання, і па глыбіні вывучэння паэзіі. Маладыя аўтары пачынаюць з тэхнічна састарэлых, «пушкінскіх» стандартаў, абіраюць не тыя эталоны для натуральнага юнацкага пераймання — а потым здзіўляюцца, калі ім кажуць аб недапушчальнасці дзеяслоўнай рыфмы. Такі ж перакос існуе і ў праграме беларускай літаратуры, дзе вельмі шмат часу адводзіцца на класічныя вершы Купалы і Коласа і не вельмі — на творы больш сучасных паэтаў.

Тут я не перакрэсліваю славу нашых «песняроў», асабліва — іх дасягненні як першапраходцаў. Як і Пушкін у рускай паэзіі, яны — наша ўсё. Аснова. Падмурак. Але жыць у доме, дзе ёсць толькі падмурак, немагчыма.

І праз гады і ад моладзі, і ад старэйшых паэтаў на пытанне «А якую паэзію чытаеце? Хто падабаецца з паэтаў?» мы чуем адны і тыя ж адказы: «Пушкін — наша ўсё», «Купала», «Колас», «Нашы песняры», «Ясенін часам…» Таму што са школьных гадоў мы чулі, што вось яны — гэта нешта сапраўднае, «песняры», «класікі, на якіх патрэбна арыентавацца». А тое, што паэзія ад гэтых класікаў прайшла велізарны шлях развіцця, што яна ўзбагачалася, удасканальвалася з кожным дзесяцігоддзем — гэтага нам не казалі.

Мець любімых аўтараў любога часу не соромна, але соромна замыкацца ў адзіным крузе паэтычнага чытання, не спрабаваць удзельнічаць у літаратурным працэсе і пашыраць сваю чытацкую эрудыцыю. І досыць сумна, калі аўтар выпрацоўвае для сваёй паэзіі змярцвелы стандарт і піша па ім.

З якімі «пасткамі састарэласці» мы часцей за ўсё сутыкаемся ў сучаснай паэзіі?

Перш за ўсё — банальная, нецікавая рыфма. «Сонца — аконца», «у Беларусі — ганаруся», «хата — багата/каты/брата», «цяпло — святло — жытло», «хмары — мары», «каханне — расстанне — вяртанне» і г. д. Няўжо беларуская мова настолькі бедная, што мы так часта звяртаемся да адных і тых жа сугуччаў? Само па сабе ніводнае з іх не з'яўляецца катастрофай, але калі сабраць некалькі такіх у адным творы, ды яшчэ аздобіць дзеяслоўнымі рыфмамі…

Дарэчы, пра дзеяслоўныя рыфмы. Ужо шмат разоў казалася — і крытыкамі, і паэтамі, — што дзеяслоўныя сугуччы перасталі лічыцца чымсьці больш-менш дапушчальным дзесьці ў шасцідзясятыя гады XX ст. Як, зрэшты, і наогул рыфмы аднолькавых часцін мовы — з-за сваёй відавочнай прастаты. Аднак з дзеясловамі сітуацыя сапраўды палохае: бясконцыя «прыйшоў — узышоў — знайшоў», «пяю — пазнаю», «смяюся — імкнуся — ганаруся» — гэта відавочна не прыкмета добрай паэзіі. Зноў жа, адна-дзве дзеяслоўныя рыфмы — не канец свету, асабліва калі яны арыгінальныя, цікавыя. Але калі такіх рыфмаў шмат і яны яшчэ зафарбаваны знаёмай вобразнасцю…

А якія знаёмыя вобразы мы раз-пораз сустракаем у беларускай паэзіі? Калі справа тычыцца прыроды — важная хада буслоў, россыпы журавін на балотах, жыта, раллё, звон ручаёў... і трэба не забыцца на абавязковыя васількі. З параўнальна новых вобразаў можам далучыць пахі — грыбоў або бэзу. Што мы забыліся дадаць у гэты некалькі стандартызаваны вобраз беларускай прыроды? Песні жаўрука ці блакітныя вочы азёр?

І калі гаворка ідзе яшчэ і пра настолькі знакамітыя метафары і эпітэты — вось тады ўсё сапраўды дрэнна. Калі лісце — дык адзенне, калі ручаі — звонкія і ў срэбры (у беларускай паэзіі яны яшчэ часта гамоняць), каласы хіляць галовы, зязюля лічыць гады (як яна лічыла яшчэ пры Купале), асенняе лісце палае пажарам ці абарочваецца золатам — як сто гадоў таму. А сосны шумяць/шапацяць, таму што не разумеюць — чым яшчэ можна займацца ў вершах нашых аўтараў?

І тут гаворка толькі пра прыроду — а колькі падобных мастацкіх штампаў можна адшукаць у сучаснай філасофскай, любоўнай, грамадзянскай лірыцы?

Але, можа быць, гэтае новае ўжо не адшукаць? Можа быць, паэзіі папросту больш няма куды развівацца? Магчыма, новыя творчыя хады сышлі ў нябыт яшчэ пры шасцідзясятніках, збіліся сцежкі мастацкіх прыёмаў, сцёрліся тэмы? Нарэшце, можа быць, зямля беларуская проста не нараджае больш магутных паэтаў?

Аднак ёсць шмат аўтараў — маладых і сталых, расійскіх і беларускіх, — якія ўсё ж адкрываюць для сябе новыя тэмы і нараджаюць новыя вобразы. І гаворка не толькі і не столькі пра модныя формы, накшталт верлібра, не пра паэтычныя формы з нагрувашчваннем разгорнутых метафар, але пра спробы прыўнесці нешта нетыповае ў класічную паэзію. Не пра рэвалюцыю ў літаратурным працэсе, але пра невялікія крокі ў кожным творы: інтанацыйныя, тэматычныя, мастацкія... Ці робіць гэта аўтараў «вялікімі»? Наўрад ці. Аднак гэта робіць іх прынамсі блізкімі да паняцця «сучасны прафесійны паэт».

Вечныя тэмы будуць заўсёды. І мы заўсёды будзем звяртацца да іх пры дапамозе класічнай паэзіі. І заўсёды задачай сапраўднага паэта будзе — каб гэты зварот не выйшаў «навязлым у зубах» перапевам класікаў. Каб вершы былі не толькі зразумелымі сучаснаму сярэдняму чытачу, але і ў вачах чытача патрабавальнага, які перачытаў мноства іншых твораў і іншых аўтараў, былі маленькім адкрыццём.

Мала выказваць свае думкі ў вершах, каб быць сапраўдным паэтам. Мала выпускаць зборнікі, выступаць перад публікай рознай ступені патрабавальнасці. Адшукваць невымоўнае, адкрываць новыя грані творчасці — вось абавязак тых, хто лічыць сябе не аматарамі («пішу проста для сябе і часам чытаю тым, хто таксама піша для сябе, а потым мы адзін аднаму апладзіруем»), а прафесійнымі аўтарамі.

Не, гэта не прапанова адразу кінуцца ў гульню з новымі формамі або скінуць нашых паэтаў «з парахода сучаснасці». Гэта прапанова якраз ступіць на палубу гэтага парахода. І перад тым, як прачытаць тэкст шырокай публіцы, змясціць яго ў зборнік або адаслаць у часопіс — зірнуць на новы свой твор іншымі вачыма. А потым сабрацца з духам і спытаць: а ці сапраўды гэты твор новы?

І калі адказ будзе не цвёрдым: «Так!» — магчыма, адкласці тэкст у стол у чаканні, калі муза адорыць свайго творцу нечым лепшым.

Алена КІСЕЛЬ

Красавік. Палаюць дзьмухаўцы

Днямі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» свет пабачыў шосты выпуск альманаха «Першацвет». Змест выдання склалі творы пераможцаў VI Міжнароднага конкурсу маладых літаратараў. Прэзентацыя кнігі прайшла на галоўнай сцэне XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу (падрабязней пра падзею мы пісалі ў мінулым нумары). Дзесяць паэтаў і дзесяць празаікаў вылілі на старонкі зборніка ўласныя боль, сумневы, а яшчэ падзяліліся з чытачом уяўленнямі аб шчасці, Богу і сэнсе жыцця. Паглядзім жа, што з таго атрымалася.

Зборнік адкрываецца душашчыпальным апавяданнем Дзмітрыя Аўчыннікава «Яшчэ адзін дзень», сюжэт якога на дзіва адпавядае назве. Чытач назірае павольнае згасанне чарговага дня жыцця немаладой і самотнай доктаркі Ларысы Міхайлаўны: кармленне галубоў у парку, чаканне запаветнага званка пад шум тэлевізара і непраглядная адзінота… Тлум штодзённасці згушчаюць назойлівыя думкі галоўнай гераіні: улюбёны фільм — «Дзень сурка», пацыенты адны і тыя ж — шэрыя пенсіянеры, якія «ходзяць у паліклініку як на працу», а злашчасныя дамы і мясцовыя славутасці, «здавалася, існавалі задоўга да яе, Ларысы, зараз існуюць пры ёй і будуць існаваць бясконца доўга пасля яе». Пачуццё дэжавю не пакідае гераіню — і нас разам з ёй! — ні на секунду.

Рэчыўны свет, у якім існуе маленькі чалавек Ларыса, апісаны, магчыма, задужа буйнымі мазкамі, што з лішкам кампенсуецца ўдала падабранымі моўнымі характарыстыкамі. Хоць гераіня наша фармальна належыць да класа (сацыяльны пафас, абраны аўтарам апавядання, вымагае выкарыстаць менавіта гэтае слова) інтэлігенцыі, яна, тым не менш, паходзіць з простай сям'і і час ад часу дазваляе сабе прастамоўі. Аб яе прафесійнай прыналежнасці і адукацыі нагадваюць лацінскія ідыёмы, шчодра раскіданыя па тэксце (*ex novo*, *quantum satis*, *cercle vicieux*). Аповед вядзецца быццам бы ад асобы аўтара, але чытач разумее: перад намі — рух думак галоўнай гераіні, мы ўнутры яе галавы.

Найстарэйшаму з аўтараў, прадстаўленых у зборніку, Алесю Бараноўскаму, 34 гады. Менавіта яго вершам — класічным па форме і вечным па тэме — выпала адкрываць пярэстую паэтычную падборку «Першацвету». І хоць, чытаючы «самыя дарослыя» творы ў зборніку, можна незнарок прыйсці да высновы, што не трэба чакаць ад новага дня нічога, акрамя смерці папярэдняга, «усё-ткі ў душы прарастае жаданне адвечнае — жыць». Магутнай прагай да жыцця вылучаюцца і вершы іншых аўтараў: будуць гэта біблейскія рэмінісцэнцыі Паліны Басалыгі ці легкадумныя жыццёвінкі Яніны Босак.

Тэма працягваецца ў празаічных нататках-успамінах Сафіі Ворсы «Кіламетры думак»: «А я сяджу, гляджу на вогненныя горы, запальваю цыгарэту і разумею, што няма нічога важнейшага ў свеце. І наогул няма нічога. Толькі горы, матор унізе, цыгарэта, я і Назар, які спіць». Можна, грэшным чынам, падумаць, нібыта юную пісьменніцу дадаюць у падобныя зборнікі па інерцыі, але гэта зусім не так! Патэтыка і пэўная максімалісцкая нясціпласць твораў Ворсы па-ранейшаму гляджуцца лепш, чым вопыты многіх «дарослых» аўтараў.

Наадварот, дастаткова сціпла, але не без іскры, прагучалі нешматлікія вершы Алеся Гомана і Паліны Дваранскай у працягу зборніка. Ідэйную пару фарміруюць «трыпціх» апавяданняў Ягора Жукоўскага «Не нам, не нам, а імю Твайму» і эсэ Паліны Корневай «Мабыць, у той дзень»: аўтары, кожны ў меру сваіх пісьменніцкіх здольнасцей, даследуюць пытанні духоўнасці і захавання традыцый. Тэма тагасветнага знаходзіць развіццё ў апавяданні Аляксандры Кароль «Сумоўе», што ў гумарыстычным рэчышчы абыгрывае нябесную бюракратыю і дзіўным чынам трансфармуецца ў яе ж «Розных» пра ціхае каханне вучонага і летуценніцы. «Як дзеці, далібог», — прамаўляе апостал Пётр, старшыня верхняй Канцылярыі, вырашаючы далейшы лёс людскіх душ.

Бадай, адна з найлепшых паэтычных падборак у выпуску — нізка вершаў Андрэя Кімбара, героі якіх «з усмешкай з'ядаюць санеты» ды кавай запіваюць верлібры, — знамянуе сабой пераход на другую палову кнігі. Адварот старонкі — і перад чытачом раскінуцца падманліва простыя вершаванкі Ірыны Макарчук. Няхай класічныя формы і даюцца паэтэсе з цяжкасцю, на полі свабоднай паэзіі роўных ёй у зборніку амаль што няма: «Аднойчы // Спяшаючыся ісці // Бегучы // Упарта // Ты не заўважаеш // Што // Расцвілі // Дзьмухаўцы». У сваю чаргу у апавяданнях з цыкла «Запаветнае жаданне» Юлія Макарэвіч прапануе славянскае фэнтэзі. Наадварот, рэалістычны і нават бытавы падыход вызнае Іван Мелаў, чые экзістэнцыяльныя навелы «Вадалазы» і «Перад вачыма» спрабуюць перадаць вопыт сустрэчы са смерцю, пачуццё, якое ахінае чалавека на краі прорвы.

Яркімі фарбамі зіхацяць незвычайныя рускамоўныя рыфмаванкі за аўтарствам Вольгі Міхаленкі. Цудоўныя ж вершы на беларускай мове Яўгеніі Пракапчук, якія ідуць следам, могуць спрачацца за званне найпрыгажэйшай паэзіі ў зборніку. Як ні дзіўна, паэтычная інтанацыя не заціхае нават у прозе. Казачныя «імпрэсіі» Яны Цэглы пад агульным загалоўкам «Метамарфозы» — найлепшае таму пацвярджэнне. Тэксты «Крумкач і Лябёдка», «Леў» і «Муха з чалавечым вухам» здзіўляюць сваёй парадаксальнасцю, суіснаваннем на адной старонцы вялікага і маленькага, гіпербалы і літоты. Пачынаючыся з немудрагелістых эківокаў накшталт шпакоўні «з круглым уваходам для квадратных шпакоў», такія творы ператвараюцца пад канец у нешта прынцыпова іншае — у гісторыю прыняцця сябе альбо аповед аб найвялікшым каханні.

Схаваўшыся за рускамоўнай аповесцю Мацвея Шышко і лірычнымі мініяцюрамі Вольгі Шпакоўскай, зборнік завяршаюць мініяцюры празаічныя — ад наймалодшай з пераможцаў VI Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Першацвет», вучаніцы восьмага класа Маргарыты Ядзевіч. Рускамоўныя апавяданні «Зефір і снег», «53-і тралейбус», «Смайлік пад святлафорам», «Ты — батарэя» і «Высакародная сандаля» выяўляюць надзвычайную праніклівасць і назіральнасць іх аўтаркі, чый голас, як і галасы іншых удзельнікаў альманаха, гучыць пераканаўча, упэўнена, цвёрда — а гэта самае галоўнае!

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

«Упала ніцма поўня сярод хваляў…»

Што чакае нас у будучыні? Настае час, калі пачынаеш задаваць сабе гэтае пытанне, але, на жаль, адказу не атрымліваеш. Можа быць, нічога, і ўсё лепшае з намі ўжо адбылося. Бо мы больш не адчуем эмоцый першага падлеткавага кахання, не ўспомнім прыемны стан наіўнай дзіцячай бестурботнасці і ніколі не зведаем той шчырай радасці, якой нас цешылі звычайныя рэчы. А можа быць і наадварот: усе светлыя эмоцыі мінулага стануць цьмянымі на фоне новага, значна ярчэйшага святла будучыні. І часта гэта залежыць ад нас саміх. Падказак не будзе, і мы самі павінны знайсці правільны шлях.

Менавіта з такіх думак хочацца пачаць свой водгук на нізку вершаў «Лекі для душы» Рагнеда Малахоўскага, якая надрукавана ў лютаўскім нумары часопіса «Полымя». Нягледзячы на традыцыйную форму і тэматычную заглыбленасць у беларускі фальклор, вершы выглядаюць вельмі сучаснымі і актуальнымі.

Гатавічы — маляўнічая вёска на паўночным захадзе Мінскай вобласці паміж азёрамі Нарач і Мястра. Там прайшло дзяцінства Р. Малахоўскага — невыпадкова, што паэт значную ўвагу ўдзяляе тэме малой радзімы, яе міфалогіі.

Тут песні беражніц не чутна ўжо.
Упала ніцма поўня сярод хваляў.
Тут столькі нема з дна крычыць крыжоў!
Тут хвалі столькі душаў пахавалі!

Філасофскі падтэкст, успаміны пра мінулае, якія перагукаюцца з цяперашнім і будучым... Нават трапяткі верш, дзе намаляваны яркі захапляльны момант з дзяцінства — святкаванне Купалля на беразе Нарачы — заканчваецца неадназначна і прымушае задумацца.

Ды ці зведалі большага шчасця,
Чым агонь трапяткога дзяцінства?

Багатае вобразнае мысленне Р. Малахоўскага дапамагае чытачу пражыць тыя чароўныя імгненні.

Злосна вецер хістаў полымя...
Мы ў вачах бераглі тыя іскаркі,
Акуналіся ў возера голымі
І начной захапляліся містыкай.

Паэт знаёміць і нас з пошукам таго шчасця. Пры гэтым шукае яго ў розных месцах, не баіцца азірнуцца назад і ўпэўнена глядзіць наперад.

Пастаянны рух у творах характарызуецца менавіта гэтым пошукам. Вобраз ракі, якая ніколі не спыняецца і нясе нас па імклівай плыні часу, у вершы «Рэкі». І ціхая, як бы застылая водная роўнядзь возера ў вершы «Гатаўскія ямы», па якой мы павольна рухаемся да берага з ветракамі ўдалечыні. Гэта ўяўляецца своеасаблівымі знакамі будучага і мінулага, што яшчэ мацней падкрэслівае выразнасць і метафарычнасць творчасці.

У сэрцы і душы лірычнага героя гэтак жа ўвесь час цячэ жыццё. А ў вершы «Ты бачыў смерць» адбываецца ўнутранае пераразжэнне, усведамленне таго, што не толькі мы самі, але і іншы чалавек можа змяніць нас, дапамагчы адшукаць тую самую запаветную мэту.

Ты бачыў смерць. І пажадаў стаць новым.
З упэўненасцю крочыць па жыцці.
У іншым чалавеку выпадковым
Надзейнае апірышча знайсці.

Сваім светаадчуваннем, мастацкімі вобразамі і тэматыкай вершаў Р. Малахоўскі сцвярджае, што патрэбна ўмець паважаць навакольны свет, людзей з іх праблемамі і радасцямі і нават смерць.

Пошук унутранай гармоніі і свайго сапраўднага прызначэння цесна звязаны ў творах з яшчэ адной важнай для кожнага чалавека тэмай — кахання. Быць можа, усё, што нам трэба для радасці ў жыцці, гэта якраз той адзіны выпадковы чалавек, які і запоўніць самотную душу. Менавіта такія думкі ўзнікаюць пры чытанні некаторых радкоў.

Каханне ў вершах адчуваецца спакойным і далікатным. Яно не ўрываецца ў жыццё, а ўваходзіць павольна і акуратна:

Ты ўзлятаеш увысь закаханай.
І страшна ўпасці.

Шчасце часам здаецца дзесьці побач, а часам, наадварот, далёка. Гэта вельмі інтымнае, мімалётнае адчуванне, якое мы можам усвядоміць толькі праз час.

Ці захмурнее надвячорак,
Ці вочы радасцю гараць —
Сваё каханне аж да зорак
Мы не стамляемся ўзнімаць.

Вершы Р. Малахоўскага чытаюцца лёгка, гэтаму спрыяе выключнае пачуццё рытму паэта, а таксама добрыя, нязбітыя і арыгінальныя рыфмы. Канструкцыі радкоў не перагружаны і не дадуць збіцца з рытму нават пры першым чытанні твораў. У вершах прысутнічае яскравая вобразнасць, якой часам бракуе некаторым паэтам. Варта таксама адзначыць асобныя выразныя знакі, якія вандруюць з аднаго верша ў іншы. Напрыклад, вобраз світанку ўяўляецца ў творах як будучыня, якая непазбежна настане, пры гэтым ад яе вее цяплом і становіцца радасней на душы.

Асобна варта згадаць фіналы вершаў, дакладней, іх апошнія строфы. Большасць з іх нясуць у сабе надзею і маюць светлую афарбоўку. Часам узнікае ўнутранае напружанне, і да ўжо прачытаных раней слоў пачынаеш ставіцца паіншаму. Тонкай стужкай скрозь радкі пралягае думка аб тым, што ўсе нягоды можна пераадолець.

Напрыканцы хочацца працытаваць некалькі важных і дакладных радкоў з верша «Лекі для душы»:

Паэзія!
Няма найлепшых лекаў
Для стомленай душы
Бяздушным векам.

У нашым, як кажа паэт, бяздушным свеце многія пачалі забываць праўдзівыя сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці, шчырыя пачуцці і проста згубіліся ў мітусні дзён. Аднак Рагнед Малахоўскі не з такіх. У яго вершах чалавек жыве, кахае, ідзе наперад, пераадольвае цяжкасці, а галоўнае — думае. Менавіта гэтага так бракуе сёння.

Артур АЛЯШКЕВІЧ

Алёна ПАПКО
Брэсцкая вобласць

* * *

Як цюцікі, змёрзлыя
Да касцей —
Агністыя гронкі рабін.
Адхукаць бы іх,
Як пальцы, падчас завей,
Як абвуглены ўспамін.

Растапіць бы іх шкуркі з ільдоў,
Пад якімі — сэрцы жывыя
Б'юцца альбо біліся
Напярэдадні халадоў,
Пакуль адно аднаму не сталі
Чужыя…

* * *

Мне б да зімы дакрануцца
Лёгка
Шчакой ці рукой.
Мне б да зімы прыхінуцца
Згалелай пяшчотай сваёй.
Звяжа адно, а другое развяжа
Час, як бывала спрадвек.
І на душу маю досвіткам
Ляжа
Чысты карункавы снег.

* * *

За сівымі снегападамі,
за празрыстымі ледзяшамі
Згубілася завея кляновая,
барвовая…

Снег, снег, снег…
Мяккі і сыпучы,
падобны да надзей і спадзяванняў
неўміручых.

Пад белымі вершалінамі,
халоднымі зорамі
згубіліся і мы невядомыя.
Выпадковыя.

* * *

Прымі, дурніца, свой лёс. Прымі.
У далонях дажджавой вады
Не ўтрымаць,
Як і таго, хто сатканы з яе.
Патрэбна ўмець адпускаць,
Зацягнецца, зажыве…

Як праз пальцы пясок, да апошняга
Да растка
Зразумей, што чаканне тваё ўзрошчана
Дарма.
Жораву — лепей у вольныя далячыні.
…Снежань скінуў на дол апошні
Пялёстак вяргіні.

* * *

Час на ўзыходзе — прадвесне,
Сонца паспешлівы крок,
А ў мімалётнае песні
Кнігаўкі чуць галасок.

Путы зрываючы смела
Прымаразкаў і вятроў,
Вітае прастора ўзмужнела
Ўсмешкамі дзьмухаўцоў.

Вось яно, блізкае шчасце,
У кожным расістым глытку!
Дзе што ні кропля — прычасце
Словам у простым радку.

Трымаючы досвіткам белым
Працягнуты лёсам карэц,
Будуць услаўлены ў сэрцы
Кнігаўка і дзьмухавец!

Лепшы дзень

О промень, абудзі наўкол узлескі
І вызваль ад скрыпучых маразоў!
О сэрца, адгукніся ціхай песняй
На шум трывожна-мклівых палазоў.

І не шкадуй таго, што так гарчэла,
А потым адплыло,
як мройны дым.
Пралескаю блакітнай, снегам белым
Складай, дзень лепшы,
шчасця майго гімн!

І чым далей ад сцюж над бураломам,
Тым наймацней гучы,
і кроў бунтуй,
І адгукайся васільковым звонам —
Вяртання крылы смеласцю мацуй!

Гары на вуснах радаснаю ўсмешкай,
Мой лепшы дзень, няўзнак не абміні.
На золкім ветры, дзе за сцежкай —
сцежка,
Каханнем светлым, вечным атулі!

* * *

З калючых гушчароў —
Апёку стыць бясконца! —
Да родных бальшакоў
Мы знойдзем шлях па сонцы!

І з цемры неспадзеў
Да светлай каляіны
Нас выведзе твой спеў,
Жаўронак званкакрылы!

І стане на душы
Зноў лёгка і пявуча.
Да сэрца, спарышы,
Гаіце неўміруча!

Шаўковай муравой
Зім мёрзласць зарастае.
Да любых бальшакоў
Шлях сонечны вяртае.

Палёт

Імкнучыся да гулкай вышыні
І падаючы, што аж крылы стогнуць…
Ці можа быць па-іншаму ў жыцці?
Ці чалавечы лёс — палёт над прорвай?

І колькі ні бярэ, усё мала ёй,
Глухой да шкадаванняў і спагады.
Таму лаві, што моцы ёсць, рукой
Шчаслівыя імгненні зарападаў.

Бо прыйдзе час прарочы ўбачыць сон:
Які гатуе шлях для нас бясконцасць?
На развітанне суджана з зямлёй
Стаць жменькаю яе ці промнем сонца?

* * *

Белыя, белыя, белыя аблачыны.
Жвавыя, жвавыя, жвавыя ручаіны.
Даплыві, даплыві
Скрозь дажджы, скрозь снягі
Да куточка дзяцінства,
Дзе яблыні ў квецені.

Ясная, ясная, ясная бліскавіца.
Гонкая, гонкая, гонкая плынь-вадзіца.
Да глыточка — глыткі,
А да пёрка — вяршкі
Родных яблынь у квецені.

Дрогкае, дрогкае,
дрогкае люстра-шкельца.
Стылае, стылае, стылае сноў акенца.
Узмах крыла, сон-трава,
А апоўдні вясна,
Век не выплысці з квецені.

Сінія, сінія, сінія хвалі-да́лі.
Золкія, золкія, золкія далі-хвалі.
Ад зямлі — два крылы.
Ты пакліч, вышыня,
Каб душою святлець ад
Той белае квецені!

Алесь ГОМАН
Мінск

* * *

Лейцы мне пякуць далоні.
Сэрца грукат не чуваць.
Раскажыце, злыя коні,
Калі час мой паміраць?

Вы — апошнія анёлы —
Выпраўляйце мяне ў шлях.
Хутка стану я вясёлым?
Дык наперад! Боль і страх

Страціў недзе па дарозе.
(Не шкада мне гэтых двух!)
Як жа добра на марозе
Ды ў палоне завірух.

І, здаецца, я адзіны,
Хто пражыў сваё жыццё,
Перад прорваю спачыну
Кволы ўсё ж, нібы трысцё.

Дык хутчэй, сівыя коні,
І няхай згарае снег!
Еду я. Няма пагоні.
Толькі збоку нечы смех...

* * *

Дагарае ў зорках неба.
Ціха спіць сусветны рай.
Мне нічога больш не трэба:
Не сумуй, пішы ды грай.

Жыў, жывы —
не трэба болей.
Хто я, проста чалавек?
Я паэт, паэт няволі,
Што шукае свой каўчэг.

За радкамі шумных вершаў
Ды за сотнямі бяроз
Буду жыць,
як быццам першы,
Раз жыву свой страшны лёс.

* * *

Лёс па лесвіцы ідзе
Крокамі-радкамі.
Не скуеш яго нідзе
Нават ланцугамі.

* * *

Я забыў пацалункі ля млына
Ды палёгку даверлівых фраз.
Мне твой твар так знаёмы,
дзяўчына!
Але бачу цябе першы раз.

Ты прыходзіла музаю вершаў,
А сыходзіла ранішнім сном.
Не апошнім я быў
і не першым,
Каго бачыла ты жаніхом.

Ты чакала, глядзела, маліла.
Вось ён я!
Пахавай ля дубоў.
Невядома мне,
што ты за сіла:
Ці каханне, ці можа, любоў.

Таццяна БАРЫСЮК
Мінск

Што такое каханне?
(залатое сячэнне перавернутае)

Каб БЫЦЬ, патрэбна і КАХАЦЬ,
бо без мілосці свет панылы,
па любым зрэдчас уздыхаць,
у марах бачыць вобраз мілы.

Даваць і браць часцінкі шчасця,
акрыльваць і прымаць натхненне,
свет — праз яго! — душою мацаць,
ісці — услед за прыцягненнем.

Спрабую адчуваць давер.
Табою быццам апантана.
Хто ты — анёл ці люты звер?
Мы разам ці чакаць расстання?
О Божа, дай жа нам каханне!

Зімовая імпрэсія
(залатое сячэнне перавернутае)

Зіма. Завея. Бель. Мароз,
як сто гадоў таму ці вечнасць.
Бог з неба пуху панатрос,
бо ў новы год сняжок дарэчны.
Мінаюць дні. За годам год,
як карусель — за колам кола.
Жыцця імклівы карагод,
сезонаў змены ў наваколлі.

АН і Батанічны сад
вітаюць ведай апантаных.
Не азіраймася назад:
там засталіся нашы раны.
Ёсць толькі рай — для закаханых…

Фота Кастуся Дробава.

Далёкае красавіцкае

Дзённікавыя нататкі

Віктар ШНІП

Красавік. Вучуся ў 7 класе. У панядзелак на апошнім уроку зайшла класны кіраўнік і папярэдзіла, каб усе заўтра прыйшлі ў школу добра апранутымі і падрыхтаванымі — з Валожына прыедзе праверка, і хто атрымае двойку, таго выганяць са школы. Вярнуўшыся дамоў, — а я моцна напалохаўся будучай праверкі — і, прыкінуўшы, што мяне за двойку могуць выгнаць са школы, вырашыў заўтра не хадзіць на заняткі. А каб не пайсці вучыцца, надумаў захварэць. І пайшоў я ў Гаік да сажалкі, на якой яшчэ цалкам не растаў лёд. Разуўшыся, зайшоў у ледзяную ваду. Стаяў, пакуль ад холаду не пачало калаціць. Вярнуўся дамоў прамерзлы да касцей. Залез на печ, дзе сябе адчуў хворым. Пачаў кашляць. Мама, пачуўшы мой кашаль, захвалявалася: «Ну што там? Захварэў?» — «Захварэў…» — прамармытаў я. «Заўтра сядзі дома!» — сказала мама. І назаўтра я не пайшоў у школу. Аднак не захварэў, а з Валожына праверка не прыехала…

Вясновая паводка. Якраз у гэты час у школе вакацыі. Абуўшы бацькавы гумовыя боты і ўзяўшы нататнік, іду ў затоплены Гаік. Дабіраюся да купіны, на якой расце бярозка, і саджуся, як пісаў Алесь Пісьмянкоў, думаць вершы. Навокал вада, і я гляджу ў ваду і бачу неба, у якім плывуць аблокі, чапляючыся за леташнюю мёртвую траву. У школе вывучаем «Новую зямлю», і мне хочацца напісаць нешта падобнае, але сваё. Нічога ў галаву не прыходзіць, і я, прасядзеўшы гадзіны дзве сярод паводкі і потым яшчэ набраўшы вады ў боты, вяртаюся дахаты...

Два тыдні не хадзіў у школу — хварэў на адзёр, і свае чатырнаццаць гадоў сустрэў у ложку. Ляжаў з высокай тэмпературай і часам думаў, што памру. Вокны ў хаце былі завешаны, каб у мяне ад святла не псаваўся зрок. Было страшна і хацелася жыць. І калі ачуняў і ўпершыню выйшаў на вуліцу, дзе навокал ужо амаль растаў снег і ў агародзе ў аблітай граззю траве капаліся чарнюткія, аж бліскучыя, шпакі, я заплакаў. Пастаяўшы хвіліну, сеў на лаўку каля хаты. Паветра пахла жыццём. У чыстым небе, як у калодзежнай вадзе, шавялілася залатое сакавіцкае сонца. Паглядзеўшы на яго, я чыхнуў, з носа пайшла кроў. На нейкі момант спалохаўшыся, зацiснуў пальцамі нос. Кроў чырвонай змейкай папаўзла па руцэ і схавалася пад рукавом, пакінуўшы за сабою чырвоную палоску, нібы святочную стужку...

Праз пару дзён Вялікдзень. Вярнуўшыся са школы, з мамай іду за Юстынаву гару капаць хрэн. На былым іржышчы, вызваленыя з-пад снегу, сохнуць мышыныя гнёзды. У небе над намі трапеча жаўрук, рассыпаючы сваю радасную песню на зямлю, якая ажывае пасля марознай зімы. Прахадзіўшы па полі больш за гадзіну і знайшоўшы толькі некалькі карэньчыкаў хрэну, вяртаюся з мамай дамоў. Праз пару дзён Вялікдзень…

«Я быў закаханы ў Снягурку. Я верыў: яна існуе. Хадзіў па заснежаным лесе, пытаў пра яе ў завей», — такое было са мной у дванаццаць гадоў. Потым у ляску за роднай хатай сярод бяроз і асін я напаткаў невялічкую ялінку, да якой хадзіў і расказваў свае крыўды і радасці, чытаў вершы, плакаў… Усё прайшло… І мне хочацца плакаць, але я не плачу… Усё. Прайшло…

14.04.2010. Па тэлевізары ўсёй сям'ёй кожны вечар глядзім конкурс дызайнераў-мадэльераў «Подиум». І я амаль кожны раз успамінаю сваю бабулю Параску, якая была швачкай. Яе, як цудоўную майстрыцу, людзі ведалі далёка ад нашых Пугачоў. Бабуля сама прыдумляла фасоны адзення, кроіла, шыла і вучыла іншых. Гэтым усё жыццё і пражыла. Я і сёння памятаю сшытыя ёю касцюмы, сукенкі, блузкі, бравэркі, кажухі, штаны-галіфэ і часам адчуваю плячамі цяпло ад палітца, якое яна мне справіла да майго першага класа…

Пасля ўчарашняга дажджу паветра загусцела і запахла бярозавым сокам…

Наўзбоч сцяжыны праз Мухлю пачарнелы снег і ручаіны праз сцяжыну нагадалі мне, як гадоў трыццаць таму ў час паводкі дабіраўся ў свае Пугачы. Аўтобус дайшоў да Бузуноў і вярнуўся назад у Мінск, а я і яшчэ некалькі чалавек пайшлі далей. Да Пугачоў было кіламетраў пятнаццаць. Абапал насыпной дарогі цякла вада, на дарозе стаяла балота, а месцамі і дарогі не было. Ішоў доўга. Амаль цэлую вечнасць. Успамінаў пражытае за свае дваццаць, чытаў сам сабе свае вершы, лічыў крокі і шкадаваў, што не паехаў, як некаторыя, назад у Мінск. Ды чым бліжэй было да Пугачоў, тым весяляй на душы. Ніхто мяне дома ў час паводкі не чакаў. Напачатку бацькі абрадаваліся, а потым задумаліся: як жа цяпер мяне ў горад пераправіць? А я нікуды не спяшаўся, бо нідзе не працаваў (ніхто не ведаў пра гэта) і таму ў вёсцы прабыў да таго дня, пакуль не прыйшоў аўтобус з Мінска. Дома з бацькамі было хораша…

Сонечна і неба чыстае, як дзіцячая сляза. Сям'ёй едзем у Чыжоўку на могілкі. На могілках у Чыжоўцы процьма народу. Усе прыйшлі і прыехалі да сваіх родных і блізкіх, і ўсе прысутныя сярод помнікаў на нейкі час сталі як родныя…

Знічка — як пісьмо ад мамы, якое не даляцела да мяне…

Дзень пачаўся з зімовай завірухі. Прыходжу да бацькі і чую: «Як там бедныя шпачкі?»

Сыплецца снег, як змерзлы дым з комінаў вясковых хат…

Мама на Вялікдзень заўсёды пякла шмат булак, і амаль усе яны былі вялікія. Вялікія, як сонца. І цяпер для мяне сонца ў небе — як вялікая велікодная булка ад мамы…

24.04.2012. Радаўніца. Дзякуючы сябрам я з Людмілай і Вовам наведалі маму…

Ракаўскія могілкі густа абстаўлены машынамі. Машыны, нібыта жалезныя чаўны вакол вострава нябыту…

Машыну пакінулі на ўзбоччы дарогі і пайшлі да мамы напрасткі па полі. Ідучы, згадаў: «Жыццё пражыць — не поле перайсці…»

Маміну магілку Вова ўчора прыбраў, і нам сёння нічога не давялося рабіць. Запалілі свечку, Люда пачытала малітву, і мы памаліліся. І я пабачыў маму і слёзы на яе вачах. Не ўсе прыехалі…

Непадалёку ад могілак — святая крыніца. Людзі бяруць ваду, як вечнасць…

Мама пахавана на ўзгорку. За метраў дваццаць ад мамы тыдзень таму быў выкапаны дол, але чалавека не змаглі там пахаваць, бо з зямлі прабілася крыніца…

Маміна магілка абгароджана так, каб потым было можна пахаваць каля яе бацьку. Праўда, я намераў зямлі каля мамы яшчэ на чатыры магілы…

Адразу ж каля мамінай магілы — кустоўе, у якім мы разгледзелі некалькі старых утравелых помнікаў. З аднаго даведаліся, што тут пахаваны людзі, якія памерлі сто гадоў таму. Значыць, і дзе пахавана мама, таксама месца не пустое, але забытае…

Ходзячы па кустоўі і расшукваючы старыя помнікі, Людміла знайшла гняздзечка з трыма блакітнымі яечкамі, як кропелькамі неба…

Развітаўшыся з мамай, вырашылі знайсці магілу літаратуразнаўцы Тамары Чабан. Магілу не знайшлі, але сярод кустоў, дзе заканчваюцца цяперашнія могілкі, знайшлі цагляную браму, праз якую сто гадоў таму людзі хадзілі на могілкі. Цяпер за брамай трава і кусты, і зрэдку ў траве бачны каменныя помнікі, як акамянелыя мачты караблёў, што плылі ў вечнасць…

Наведалі магілу мамінага брата Паўла. Ідучы да машыны, нечакана сустрэлі цётку Марыю з нявесткамі. Родныя душы…

На могілках усе: і мёртвыя, і жывыя — як сваякі…

Пасля чатырох гадзін людзі пачалі раз'язджацца па дамах, і над могілкамі, дзе былі пакінуты памерлым велікодныя яйкі і цукеркі, закружыліся грузаны. Закружыліся, як над полем бітвы…

26.04.2012. З Людмілай ездзілі ў Смаргонь, дзе ў музычнай школе раённая бібліятэка арганізавала сустрэчу чытачоў з намі…

Дзень для мяне пачаўся ў шэсць гадзін з дажджу і дарогі да бацькі. Ішоў па мокрым асфальце і ўвесь час баяўся наступіць на чарвякоў, якія павылазілі з зямлі, нібыта цяпер чэрвень. Баяўся наступіць не таму, што гадка, а таму, што чарвякі жывыя…

Праязджаючы каля Ракава, згадаў Радаўніцу, калі мы ездзілі да мамы. Усё навокал зелянее, а мама ўжо гэтаму не радуецца. Цяпер у яе свае радасці…

Указальнік на Яршэвічы. Згадаліся вёска Крапіўнікі і цётка Манька, маміна старэйшая сястра, якая памерла 9 лістапада мінулага года, пражыўшы 93 гады. Калі маме сказалі пра тое, што яе сястра памерла, мама ўжо не заплакала, бо ёй самой заставалася пражыць крыху больш за тры месяцы…

На ўзлессях яшчэ сівая трава…

Некаторыя людзі ўжо садзяць бульбу. А ў нас дома ў Пугачах у гэтым годзе будзе расці трава…

За спінай у нас сядзела маладая пара. Хлопец усю дарогу весяліў дзяўчыну. Запомнілася з іх гамонкі: «У нас у Беларусі амаль усе дамы пафарбаваны ў зялёны і жоўты і зрэдку ў сіні колеры». І сапраўды…

Праязджаючы праз Крэва, бачылі буслоў і чырванарудыя сцены замка…

У бібліятэцы нас чакалі. Сустрэлі як даўніх сяброў…

На сустрэчу з намі ў музычную школу прыйшло каля ста чалавек. Вядучыя хораша вялі імпрэзу. Была музыка, шмат пытанняў, а сваіх вершаў мы так і не пачыталі…

Едучы назад, каля Крэва ўбачыў азярыну. Захацеў даведацца назву ў жанчыны, якая села ў маршрутку ў Крэве, і пачуў: «Ніяк не называецца! Проста Крэўскае возера!»

Зноў каля Ракава думаў пра маму і Пугачы без мамы…

Дзень закончыўся сонечна і дарогай да бацькі і дамоў…

27.04.2012. У двары на дрэвах пачала распускацца лістота, і дамы, што насупраць майго, хаваюцца ў зелені, нібыта зацягваюцца зялёнай павутой…

29.04.2012. Ноччу ў двары каля дома, дзе жыве бацька, зацвілі слівы і вішні. Адламаўшы белую ад квецені галінку, прынёс бацьку. Цяпер і ў бацькі ў кватэры вясна…

29.04.2012. Гарачыня пад 30. Хадзіў босы і не адчуваў зямлі пад нагамі…

20.04.2013. З братам Вовам, сястрой Валяй і яе мужам Віцем ездзілі ў вёску…

Адразу заехалі на Ракаўскія могілкі да бацькоў. Снегу няма. Помнікі сумныя, як сіроты…

Над могілкамі праляцелі журавы, нібыта спецыяльна, каб мы паглядзелі ў неба…

Ходзячы па могілках, натрапілі на сціплую магілу, на якой напісана: «Тут спачывае нястомны працаўнік настаўнік Адам Малахавіч Прышчэпаў (11.07.1894 — 22.05.1964)».

Могілкі — гэта нашы каменныя энцыклапедыі, у якіх болей таямніц, чым тлумачэнняў...

У вёсцы каля хат суха і толькі каля нашай стаіць вада — няма каму з ёй змагацца…

У хаце на сценах два замоўклыя гадзіннікі. Адразу падумалася, што адзін мамін, а другі бацькаў…

Суседка Зіна Мальчыкава падышла да плота пагаварыць. Расказала, што два тыдні таму ў Мінску памёр яе брат Коля. Пахавалі ў Дубровах. Яму было 56 гадоў. Згадалася, як Коля ішоў у войска. Я быў на выправах. З роднага дому ў невядомы свет Колю павезлі на грузавой машыне, і цяпер на грузавой машыне Коля вярнуўся ў родную зямлю…

Суседзі з нашых бяроз і клёна спусцілі сок. Трохлітровыя слоікі пад дрэвамі свецяцца на сонцы і асвятляюць тыя часіны, калі жылі бацькі…

У садзе пад яблынямі там-сям ляжаць яблыкі. За зіму не змерзлі, і можна іх есці…

Кусты агрэсту — як скруткі калючага іржавага дроту…

Брат расчыніў стары чамаданчык, у якім мама захавала мае лісты і газетныя публікацыі вершаў. Усё пажаўцелае, нібыта з фронту…

Пасаджаныя мамай касачы вось-вось закрасуюць…

У паштовай скрынцы рудая лістота, як попел…

З сястрой вырашылі, каб зямля не дзічэла, пасадзіць грады…

Зайшлі да бацькавага стрыечнага брата Шуры, які ўжо 21 год як з жонкай Дзінай пераехаў з Маладзечна. Падарыў дзядзьку «Пугачоўскага цырульніка»…

У горад вярталіся як з планеты, на якой жылі бацькі…

25.04.2013. З сябрам ездзілі на лецішча. Дапамог яму разгрэбці кратавінне ў агародзе…

Вецер выганяў сухое лісце з двара. Здавалася, што лісце само ўцякае, баючыся, што мы зараз раскладзём вогнішча і спалім яго…

Шпакі чорныя, а песні ў іх светлыя…

Шкельцы ў траве — як ільдзінкі, што яшчэ не растралі…

Бусел стаіць у буслянцы, як чалавек пасля доўгай жыццёвай дарогі на споведзі…

Буслянка з буслом — як цэнтр вясны…

Вада ў азярыне, якая нядаўна вызвалілася з лёду, рудаватая, як гарбата з лясных і палявых зёлак…

Коцікі на вярбе, як чмялі, якія п'юць мёд з вясновага сонца і паветра…

Хвалі б'юцца аб бераг, нібыта будзяць траву…

Лапікі снегу — як белая шчыгрынавая шкура…

Ялінам няёмка, што яны ўсю зіму былі зялёныя…

1.04.2014. Дзень стаў доўгім, як дарога дадому, дзе няма бацькоў…

12.04.2014. Дзень касманаўтыкі. Ніколі не марыў быць касманаўтам. І ўсё ж у кожнага паэта ёсць свой космас…

Сын свайго часу

Аналізуючы нядаўна ў «ЛіМе» творчасць Уладзіміра Дамашэвіча, я з прыемнасцю прыгадваў, што менавіта дзякуючы яму ўпершыню надрукаваўся ў часопісе «Полымя», а крыху пазней з'явілася і яшчэ адна мая рэцэнзія — на кнігу «Добры вечар, камбат» Уладзіміра Мехава. Тады і падумаць не мог, што праз нейкі год буду працаваць разам з Уладзімірам Львовічам.

Узрушыла, усхвалявала

Пісалася даўно, а сёння, калі перачытаў свае развагі, з радасцю ўпэўніўся, што тое даўняе, якое некалі ўзрушыла, усхвалявала, па-ранейшаму ўспрымаецца гэтаксама, як і тады, калі знаёміўся з кніжкай. Не для таго прыгадваю гэта, каб нагадаць, наколькі дакладна



Фота Кастуся Дробава.

Уладзімір Мехаў.

спасціг сказанае. Уразіла пазіцыя аўтара, тая маральна-этычная аснова, што вынікае з твораў. Як бы заклікам гучала: спяшайцеся рабіць дабро. Змест апавяданняў склалі пошукі сапраўднага ва ўзаемаадносінах. У час як мірны, так і ваенны.

Апошняе відаць па творы, які даў назву кнізе. Сталася так, што лейтэнант Корсак трапіў у штрафны батальён. Праз шмат гадоў ён размаўляе па тэлефоне з падпалкоўнікам Лідавым, ад волі якога залежаў на фронце. Уладзімір Мехаў праўдзіва перадаў душэўны стан таго, хто некалі аступіўся. Уся ўвага — на характарыстыцы тых маральных змен, якія адбыліся ў жыцці: «З новым годам вас, камбат. Жадаю ўсяго найлепшага. Паверце, ад шчырага сэрца…» Гэты званок — пераадольванне бар'ера, які з'явіўся некалі паміж маладым лейтэнантам і камбатам.

Згаданыя творы, а таксама «Апошні сеанс» (імкненне дакапацца да вытокаў сапраўднага), «Гладыёлусы», «Старадаўні раманс» (роздум аб перажытым) — найлепшыя творы не толькі ў кнізе, але і ва ўсім тым, што было напісана Уладзімірам Мехавым на той час. А ў яго ўжо выйшлі зборнікі аповесцей, апавяданняў і нарысаў «Сцяг над рэўкомам» (1958), «Апошняя яўка» (1959), «Станцыя паблізу Тамбова» (1964). Галоўная вартасць іх — сувязь дня сённяшняга і ўчарашняга, вечная гармонія чалавечай дабрыні, сінтэз асабістага, прыватнага і агульначалавечага… Розныя і непадобныя паміж сабой людзі жывуць у апавяданнях пісьменніка. Часам яны і памыляюцца, але ж праз памылкі і выпрабаванні адбываецца душэўнае станаўленне, узмужненне ўласнага «я».

Шлях пачаў з «ЛіМа»

Гаворкі аб тым, ці чытаў ён маю рэцэнзію, тады не было. Хоць як не прачытаць, калі рэдакцыі «ЛіМа», «Полымя» ды яшчэ часопіса «Беларусь» знаходзіліся ў адным будынку. Аднак, у адрозненне ад некаторых супрацоўнікаў, якія тых, каго ўзяў на працу новы галоўны рэдактар Хведар Жычка, сустрэлі ў штыкі, заняў нейтральную пазіцыю. Хоць сярод тых, хто асабліва выступаў супраць «раёншчыкаў», быў і яго сябра. Бадай, спрацоўвала тое, што ў аўтабіяграфіі «Пераваліўшы за сорак…», напісанай 26 студзеня 1972 года, выказаў так: «<…> наўрад ці стаў бы літаратарам, членам Саюза пісьменнікаў, калі б <…> не стаў газетным работнікам. І наогул я глыбока перакананы, што хоць аператыўная журналістыка і вымотвае, хоць Кіраў і назваў рэдакцыйную працу катаржнай, газетная школа дае літаратару вельмі шмат». Як бы прыглядаўся, што з кожнага з нас атрымаецца. Ды і сам быў патомны газетчык.

У аўтабіяграфіі ёсць і такія звесткі: «У 1928 годзе, калі я нарадзіўся (25 сакавіка), ні бацька, ні маці мае не былі яшчэ, праўда, журналістамі. Бацька працаваў у той час у Рагачове на цагельным заводзе, маці — у друкарні. Але сам я толькі па дакументах ведаю, што нарадзіўся ў Рагачове, а першыя дзіцячыя ўспаміны мае — мінскія». Бацька спачатку працаваў у «Звяздзе», потым — у палітаддзеле МТС у Лепелі, у Барысаўскай акруговай газеце «Вясковая праўда», у рэдакцыі «Советской Белоруссии». Не вярнуўся з Вялікай Айчыннай вайны. Маці звязала лёс з «Работніцай і сялянкай» (цяперашняя «Алеся»).

Свой жа творчы шлях Уладзімір Мехаў (сапраўднае прозвішча — Няхамкін) пачаў з «ЛіМа». Прытым у сямнаццацігадовым узросце, правучыўшыся толькі некалькі месяцаў на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пастараліся з начальства: галоўны рэдактар ці намеснік. А ўсё рабілася пад наглядам адказнага сакратара, які быў пры дзяжурнай групе. І вось выходзіць чарговы нумар… На ім першы сакратар ЦК КПБ Пётр Машэраў з нейкай нагоды ўскладае вянок да манумента Перамогі ў Мінску. Усё як і мае быць. Толькі… Чамусьці Пётр Міронавіч на здымку стаіць не з таго боку, з якога павінен.

колішнія бацькавы сябры. Дамовіліся, каб галоўны рэдактар газеты Аркадзь Куляшоў падшукаў яму якую-небудзь тэхнічную работу. Аднак работнікаў у рэдакцыі не хапала, таму яго адразу ўзялі літаратурным супрацоўнікам. Каля трох гадоў працаваў у «ЛіМе», потым у шматтыражцы БДУ, а, скончыўшы ўніверсітэт, дзесяць гадоў у «Чырвонай змене». Пасля некаторы час — у літаратурна-драматычнай рэдакцыі радыё. У 1951 годзе зноў вярнуўся ў «ЛіМ». Спачатку быў загадчыкам аддзела, пасля — адказным сакратаром. Належаў да тых, хто стараўся падтрымліваць маладыя таленты. Не забыўся аб такой увазе да сябе і Рыгор Барадулін: «Год 54-ы ехаў // на пенсію, на здачу спраў, // калі Уладзімір Львовіч Мехаў // мой першы верш надрукаваў…»

З гісторыі не выкрасліш

З 1948 года выступаў з артыкуламі і рэцэнзіямі, а ў 1951-м перайшоў да нарысаў і апавяданняў, дабіўшыся асаблівага поспеху ў творах на гісторыка-рэвалюцыйную тэматыку. Да яе звярнуўся ў нечым і выпадкова: «Недзе ў кастрычніку 1955 года сядзелі мы, група чырваназменаўцаў, над планам святочнага нумара газеты. І камусьці прыйшло ў галаву расказаць маладым чытачам пра людзей, якія з часоў рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны ўвайшлі на Беларусі ў легенды і чые імёны сталі назвамі вуліц Мінска». Удакладняе: «"Круглыя" юбілейныя даты — сарака-годдзе, пяцідзесяцігоддзе Савецкай улады, — якія нарадзілі хвалю новай цікавасці да таго, што адбывалася ў дні Кастрычніка, былі яшчэ наперадзе». Шмат у чым стаў першапраходцам. Спачатку расказаў пра легендарнага начдыва Даўмана, потым пра Берсана.

Крыху пазней яму прысвяціў п'есу «Чырвоны губернатар». Разам яшчэ з адной — «Палёт» (пра лётчыцу Галіну Дакутовіч) яны ішлі на сцэне Тэатра юнага гледача. Паступова стаў працаваць у розных жанрах. 14 напісаных ім кніг не перашкаджалі абжываць і іншыя творчыя кірункі. Сярод яго набыткаў — і фільмы пра Андрэя Грамыку, Сямёна Косберга, Адама Міцкевіча, Напалеона Орду, Івана Пуліхава, Мікалая Судзілоўскага, Ота Шміта… Многія з фільмаў створаны ў суаўтарстве з рэжысёрам Юрыем Цвятковым. Як адзін са стваральнікаў цыкла гісторыка-рэвалюцыйных дакументальных фільмаў — «Рэвалюцыя дае нам права», «Мост», «Чарвякову… спешна… Ленін», «Гісторыя адной тэлеграмы» — у 1986 годзе быў удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР.

Аднак не прайшло шмат часу, як мусіў ледзь не апраўдвацца. Часы пачаліся такія, што сталі многае руйнаваць. Кніга «Далучэнне», у якой ёсць аднайменны раздзел з падзагалоўкам «Як нараджаўся адзін кінацыкл», выходзіла ў 1992 годзе. Тады Леніна бічавалі, як нікога іншага. Таму давялося пісаць як бы пасляслоўе.

Не буду ўнікаць у сэнс сказанага. Дастаткова таго, чым яно завяршаецца: «Я захоўваю ў кніжцы прачытаныя вамі запіскі не таму, што сумую па мінулым, а таму, што яны адлюстроўваюць час. Як і фільмы, пра якія ў іх гаворка. Час, што з нашай гісторыі не выкрасліш. Сын якога, хачу таго ці не хачу, і я сам». Ды крыху пра тое, што як бы ўбаку ад творчай біяграфіі Уладзіміра Львовіча, але, разам з тым, дапамагае яго лепш зразумець як чалавека.

Ас усюды ас

У 1975 годзе развітаўся з «ЛіМам». Магчыма, аб звальненні і заяву пісаў. Магло абысціся і без яе. Чаго не ведаю, таго не ведаю. Абстаноўка ж у тыднёвіку па-ранейшаму была не заўсёды творчая. Начальства лавіравала, каго пакідаць, з кім развітацца. Пры жаданні прычыну знайсці лёгка. Знайшлася яна і для Уладзіміра Мехава.

У тыя часы чарговы нумар рыхтавалі дзяжурны, так званае «свежае вока», і абавязкова хто-небудзь

Аказалася, што, калі рабілі адбіткі са здымка, негатыў у паласу паставілі не тым бокам. Так Уладзімір Мехаў стаў без віны вінаватым. Не ведаю, ці казаў ён каму пра гэта, але калі працаваў адказным сакратаром газеты «За сталинские кадры», у яго сітуацыя склалася больш сур'ёзная. На першай паласе быў размешчаны партрэт Леніна, на другой расказвалася пра нейкае мерапрыемства, звязанае з баскетболам. Пры ім здымак студэнта, які кідае мяч у кальцо. Інтуіцыя ва Уладзіміра Львовіча спрацавала ці што… Зірнуў гэтым адбіткам на святло. Атрымлівалася, што юнак б'е Ільіча па галаве. Давялося перавёрствацъ палосы, каб здымкі не перасякаліся.

Пасля «ЛіМа» вярнуўся на радыё. Туды пайшоў, дзе дагэтуль працаваў не так і шмат, але меў ужо немалы вопыт. Ён якраз і спатрэбіўся, калі пачаў весці цыкл радыёперадач «Сустрэчы ў студыі». Хоць дакладней сказаць, што прадоўжыў яго, бо працаваў над ім і будучы адказным сакратаром штотыднёвіка. Але цяпер з'явілася магчымасць цалкам прысвяціць гэтаму і сваё набытае майстэрства, і высокую эрудыцыю. За ўсім жа была вялікая ўлюбёнасць у літаратуру, мастацтва, культуру ў цэлым. З кім толькі ні гутарыў! Дакладней — з кім ні адчуваў сябе на роўных. Толькі некаторыя прозвішчы: Янка Брыль, Уладзімір Караткевіч, Іван Новікаў, Міхаіл Савіцкі, Юрый Семяняка, Іван Шамякін, Расціслаў Янкоўскі… На шчасце, многія з гэтых матэрыялаў знаходзяцца ў фондах радыё. Шмат што прадстаўлена ў яго кнізе «Сустрэчы ў радыёстудыі. Дыялогі» (1985).

Мінулае такое, якім было

Не ведаю, як у іншых, а ў мяне, калі добра ведаю каго, часам з'яўляецца такое адчуванне, што, калі захочацца з кім-небудзь пагаварыць, гэта ніколі не будзе позна. Часам забываеш, што ўзрост у чалавека ўжо, што трэба карыстацца кожнай хвілінай. Забыўся я аб гэтым і тады, калі ў Мядзеле святкавалася 100-годдзе з дня нараджэння Максіма Танка. Мерапрыемстваў было шмат. Я глядзеў нейкі канцэрт на стадыёне, забыўшыся, што ў гэты час адбываецца прэзентацыя фільма Уладзіміра Львовіча пра Максіма Танка. На прэм'еру прыйшоў позна. На яго шкадаванне «А я вас чакаў» не ведаў, што і адказаць.

Куды больш прыкра, што аднойчы не пагаварыў з ім, ідучы дахаты з Саюза пісьменнікаў. Крочачы да метро, убачыў яго здалёк. Але настрой у мяне быў не лепшы. Чаму — ужо і не памятаю. Ён жа, апусціўшы галаву, мяне не заўважыў… А жыць яму заставалася зусім мала. Пайшоў у вечнасць 7 ліпеня на 89 годзе жыцця.

Зробленае засталося. Найперш для тых чытачоў і даследчыкаў, каго цікавяць постаці тых, хто пакінуў свой след на зямлі. Да некаторых з іх сёння ставімся інакш, чым раней. У гэтым нічога дзіўнага. Кожны ж жыве ў сваім часе, але і кожны новы час па-свойму пераасэнсоўвае тое, што было раней. У тым ліку і гістарычныя постаці. Таму і стаўленне да некаторых з іх не такое, да якога мы прывыклі. У такім пераасэнсаванні таксама вялікая карысць. Гэтаму дапамагаюць і кнігі Уладзіміра Мехава.

* * *

З падораных ім кніг асабліва дарагая «Далучэнне»:

«Алесю Марціновічу — з падзякай за ўвагу да рознага мною напісанага і з самымі добрымі пажаданнямі

Ул. Мехаў.

Красавік, 1994».

Атрыманне яе ад Уладзіміра Львовіча па-свойму сімвалічнае. Тым днём з жонкай і сынамі наведвалі Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Як жа здзівіліся, калі напаткалі Уладзіміра Мехава. Яшчэ больш, што ў яго быў асобнік кнігі, якую ён тут жа паспяшаўся падарыць. Як бы нагадваў: трэба ведаць сваё мінулае. Нібы хацеў сказаць, што яно не бывае кепскім ці добрым — яно заўсёды такое, якім было. А нам разбірацца ў тым, чаго не маглі зрабіць сучаснікі. Штуршок для гэтага і тое, што за доўгія гады сваёй творчай працы зрабіў Уладзімір Мехаў.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Новае, цікавае, карыснае

З трохгадзіннай тэматычнай праграмай, з карысцю для тых, хто працуе са словам, на базе аддзела літаратуры па мастацтве Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У. І. Леніна прайшоў першы семінар прозы і драматургіі Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і абласнога літаратурнага аб'яднання «Слова».

Хто такі сапраўдны пісьменнік? Ці павінен ён быць мужным? З якімі перажываннямі сутыкаецца на працягу свайго творчага жыцця? Значная частка адказаў на гэтыя няпростыя пытанні ёсць у навеле рускага пісьменніка Юрыя Казакова «Пра мужнасць пісьменніка», з абмеркавання якой і пачаўся творчы семінар. Аналізавалі творчасць беларускага празаіка Уладзіміра Гаўрыловіча — раманы і аповесці, напісаныя ім у апошнія гады: «Палешукі», «Сэрца сваё не падманеш», «Па веры вашай…», «Святая Параскева». Як адзначыў аўтар, яго заўсёды цікавіць просты чалавек з няпростай біяграфіяй і выразнай жыццёвай пазіцыяй. Заслухалі рэцэнзію Аляксея Сазанчука «Аўтарскае разуменне гістарычнай праўды ў зборніку прозы "Святая Параскева"»; водгук аб творчасці У. Гаўрыловіча «Пра "цяжкае" шчасце і не толькі…», дасланы ветэранам педагагічнай дзейнасці, дэпутатам Кіраўскага сельскага савета Нараўлянскага раёна Барысам Гаўрылюком. На думку лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, празаіка і літаратуразнаўцы Уладзіміра Саламахі, Уладзімір Гаўрыловіч стварыў адзін з самых антываенных твораў апошняга часу ў нашай літаратуры (паведамленне «У гонар Маці» пра кнігу «Святая Параскева»).

На семінары была прадстаўлена і творчасць членаў аднаго з найстарэйшых аматарскіх літаратурных аб'яднанняў «Пралеска». З 2008 года яго ўзначальвае Ева Дударга. У цэнтры ўвагі — відэапрэзентацыя трох альманахаў «Пралеска», выдадзеных за апошнія 12 гадоў, і дзейнасць творчай суполкі па папулярызацыі чытання і кнігі ў Гомельскім раёне. Як адзначалася, «Пралеска» ў 2019 годзе стала пераможцам міжнароднага агляду аматарскіх аб'яднанняў Беларусі, Расіі і Украіны.

Аналіз мастацкіх твораў, змешчаных у альманаху «Пралеска», зрабіў кіраўнік семінара прозы Алег Ананнеў. На яго думку, значна ўзрасло майстэрства шэрага аўтараў. Былі названы найбольш удалыя спробы, змешчаныя ў выданні за 2012 год. Таксама ён рэкамендаваў прыняць у літаб'яднанне «Слова» аўтараў, якія пішуць прозу і маюць сур'ёзныя публікацыі, — Вольгу Крачкову, Анастасію Лашкевіч, Наталлю Нікіціну, Вольгу Радзівонаву.

Намеснік кіраўніка літаб'яднання «Слова» Наталля Шамяткова выступіла з аналітычным паведамленнем пра надрукаваныя ў мясцовых альманахах кароткія апавяданні Галіны Гузянковай, Наталлі Нікіцінай і Ульяны Міхальцовай. На думку Міхася Слівы, той, хто бярэцца за прозу, павінен бачыць перад сабой будучага чытача, сказаць яму штосьці новае, цікавае, карыснае… Пасля дэталёвага абмеркавання твораў і прадстаўлення аўтараў удзельнікі семінара рэкамендавалі прыняць іх у абласное літаб'яднанне.

Семінар прадоўжыўся абмеркаваннем рамана «Выпрабаванне часам» Жанны Сычовай. Галоўная выснова, зробленая паэтэсай, празаікам, публіцыстам Тамарай Кручэнкай: на Гомельшчыне з'явіўся яшчэ адзін празаік, якому ёсць што сказаць пра наша няпростае жыццё. Разам з тым прагучалі і карысныя парады аўтару.

Мікола ПРЫПЯЦКІ

Падарунак ад сэрца

Літаратурна-музычная імпрэза «Роднае слова — мелодыя сэрца» адбылася ў сталічнай гімназіі № 35 г. Мінска. Ганаровым госцем стаў Валерый Максімовіч, паэт, літаратуразнаўца, культуролаг, крытык, доктар філалагічных навук, прафесар. Знаёмства з паэтам, яго творчай і навуковай дзейнасцю, слушныя парады гімназістам зацікавілі вучняў 5—11 класаў.

Тэма Радзімы, адданасці роднай зямлі, матчына мова і плённая праца на карысць нашай роднай Беларусі сталі асноўнымі акцэнтамі мерапрыемства. Важныя словы падрастаючаму пакаленню Валерый Максімовіч перадаў праз свае вершы.

Рубрыка «Пытанне да творцы» выклікала жывы водгук. Зацікавілі прынесеныя вучнёўскія сшыткі паэта з першымі спробамі пяра. Хацелася разгледзець кожную літарку, прыгожа выведзеную рукой таленавітага і старанага хлапчука, які імкнуўся выказаць свае жыццёвыя ўражанні ў паэтычнай форме. Адказваючы на пытанне наконт літаратурных аўтарытэтаў, у ліку сваіх любімых паэтаў Валерый Аляксандравіч назваў імёны Максіма Багдановіча і Сяргея Ясеніна. Класіка ўвогуле ў асаблівай пашане ў паэта і вучонага. Пры гэтым творца не адмаўляе ролю і значэнне эксперыментатарства, прыводзячы ў прыклад Алеся Разанава, які з апорай на класіку зрабіў шмат адкрыццяў у паэзіі.

Творчыя нумары ўдзельнікаў сустрэчы напоўнілі і разнастаілі імпрэзу і, безумоўна, пакінулі ўражанні ў сэрцы шаноўнага госця. Так, вучаніца 5 класа Карына Ціхановіч падрыхтавала незвычайны падарунак да дня нараджэння паэта — прыгожы танец «Дрэва шчасця». Вучаніцы 7 класа Кацярына Панфілава і Меланія Якімава прачыталі вершы «На бацькаўшчыне» і «З верай у чалавечнасць».

У якасці падарунка літаратурнаму клубу аўтар прэзентаваў кнігу «Нацыянальны космас класікі» са сваім аўтографам. Кожнае выданне, што трапляе да нас ад выдатных пісьменнікаў, займае пачэснае месца ў музеі літклуба. Гэта вялікі гонар для гімназіі — мець сучасную бібліятэку з аўтографамі аўтараў.

Цікавымі для маладой аўдыторыі сталі вынікі плённага супрацоўніцтва паэта з вядомымі беларускімі музыкантамі і выканаўцамі. Мы мелі магчымасць праслухаць неверагодна прыгожую кампазіцыю на словы Валерыя Максімовіча «Зямля мая» ў выкананні беларускай спявачкі Аліны Чыжык, крыштальны і чысты голас якой арганічна паядноўваўся з лірыка-спеўнай споведдзю аўтара.

Падчас імпрэзы.

Сваё знаёмства з гімназіяй Валерый Аляксандравіч працягнуў у нашым этнаграфічным музеі «Спадчына». Усхваляваны ўбачаным, аўтар напісаў у кнізе ганаровых гасцей музея: «Вы сапраўды захоўваеце дух беларушчыны, нашай роднай старонкі! Дзякуючы старанням рупліўцаў і натхняльнікаў будзе жыць наша гістарычная памяць, будзе жыць Беларусь!»

Хочацца выказаць шчырыя і глыбокія словы ўдзячнасці паважанаму Валерыю Аляксандравічу, а таксама Мінскаму гарадскому аддзяленню Саюза пісьменнікаў Беларусі за вельмі плённае шматгадовае супрацоўніцтва і за тую ні з чым не параўнальную радасць і невыказныя эмоцыі ад судакранання з высокім, прачулым мастацкім словам, у якім выказана сыноўняя любоў да сваёй роднай мовы, спадчыны, радзімы.

Наталля ЛОЙКА,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі № 35 г. Мінска
Фота даслана аўтарам

Гучы, мелодыя душы!

У Доме дзіцячай творчасці Баранавіч прайшоў юбілейны вечар Таццяны Яцук — настаўніцы, філолага, паэтэсы, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўніка літаратурнага аб'яднання «Купальскія зоры» пры цэнтральнай бібліятэцы, аўтара чатырнаццаці паэтычных выданняў, суаўтара больш як трыццаці калектыўных зборнікаў, лаўрэата абласной літаратурнай прэміі Цёткі ў намінацыі «Паэзія». На словы юбіляркі напісана больш чым дваццаць песень.

Арганізатар святочнага мерапрыемства «Мелодыя маёй душы» — Зоя Кулік (Капуста), паэтэса, празаік, публіцыст, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Са змястоўнага відэароліка «Як гэта было» прысутныя даведаліся аб вытоках творчасці Таццяны Яцук, завочна пабывалі на яе малой радзіме — у вёсцы Радагошча Навагрудскага раёна, пабачылі першыя вершы будучай паэтэсы ў газеце «Піянер Беларусі», дзе яна яшчэ ў школьныя гады перамагла ў літаратурным конкурсе «Зоры Кастрычніка».

Мілагучнае, трапнае, вобразнае мастацкае слова шаноўнай юбіляркі зачароўвала гасцей святлом высокай паэзіі. Лірычны герой твораў паэтэсы — уражлівы чалавек, характар у якога прамы, просты, адкрыты і шчыры. Такі, як і сама аўтарка. Яна прызнаецца, што «калі душа спявае, верш жыве», а калі «душа сумуе, вершы плачуць».

Яскрава перадалі лірычныя вобразы паэтычных твораў выхаванцы Таццяны Мікалаеўны, вучні сярэдняй школы № 4 г. Баранавічы, якія таксама праспявалі гімн школы на словы сваёй настаўніцы.

Таццяна Яцук падчас юбілейнага вечара.

Павіншаваць Таццяну Мікалаеўну прыехалі і яе сябры — на чале са старшынёю Гродзенскага абласнога аддзялення Людмілай Кебіч. Ганаровымі гасцямі вечарыны былі намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ Дзмітрый Радзівончык, калега па пяры Аліна Сабуць. Юбілярцы ўручылі грамату СПБ за плённую літаратурна-творчую дзейнасць і ганаровую грамату абласнога аддзялення за асабісты ўклад у літаратуру Гродзеншчыны, цёпла павіншавалі са святам, падарылі вершы-прысвячэнні.

Да слоў віншавання далучылася і старшыня гаркама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі горада Баранавічы Святлана Сідаровіч, яго супрацоўнікі Алеся Васілевіч, Людміла Бачурына, Людміла Кавалёва. Святлана Сідаровіч адзначыла, што Таццяна Мікалаеўна вядзе вялікую грамадскую дзейнасць і ўзначальвае прафсаюзны камітэт роднай школы на працягу дваццаці пяці гадоў. Яна ўручыла юбілярцы ганаровую грамату прэзідыума Брэсцкага абласнога камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі за значны ўклад у рэалізацыю статутных задач, работу па забеспячэнні працоўных, сацыяльна-эканамічных правоў і законных інтарэсаў членаў прафсаюза.

Шмат добрых пажаданняў прагучала з вуснаў калег Таццяны Яцук. А мясцовы мастак Алег Ходас падарыў ёй прыгожую карціну. Яркае выступленне членаў літаратурнага аб'яднання «Купальскія зоры», якім кіруе Таццяна Яцук, і супрацоўнікаў цэнтральнай бібліятэкі імя Валянціна Таўлая г. Баранавічы (менавіта там працуе літаб'яднанне), іх крэатыўныя падарункі вызвалі гарачыя апладысменты ўсіх прысутных.

А колькі прыгожых песень на словы паважанай Таццяны Мікалаеўны і музыку Васіля Бурака, Івана Кусцінскага, Анатоля Чубенкі прагучала ў выкананні выдатных мясцовых спявачак, пераможцаў шматлікіх фестываляў і конкурсаў Галіны Бабонавай, Ірыны Мезенцавай, Рэгіны Скіпар!

Упрыгожыла творчы вечар выступленне сябра Саюза музычных дзеячаў Беларусі, аўтара каля ста пяцідзесяці песень на словы айчынных паэтаў Віктара Мяцельскага.

Валянціна ДРАБЫШЭЎСКАЯ
Фота Васіля КУЛІКОВА

Зорка і космас

Некалькі дзясяткаў скульптур, карцін, фатаграфій, прадметаў (асабліва каштоўных і важных) — усё гэта змест новай тэматычнай выстаўкі, якая адкрылася ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага як прысвячэнне асваенню касмічнай прасторы і касманаўтам. Экспазіцыя «Дыялог з космасам» расказвае аб пакарэннях, змаганнях і вялікіх здзяйсненнях, што не перашкаджае ёй быць вельмі кранальнай.

Іван Міско «12 красавіка», 2021 г.

Спачатку неабходна адзначыць, што праект прымеркаваны да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі і Дня авіяцыі і касманаўтыкі, які святкуецца 12 красавіка. Да стварэння маштабнай экспазіцыі спрычыніліся Федэральная дзяржаўная бюджэтная ўстанова культуры «Аб'яднаны мемарыяльны музей-запаведнік Ю. А. Гагарына», Дзяржаўная бюджэтная ўстанова культуры горада Масквы «Мемарыяльны музей касманаўтыкі» і Федэральная дзяржаўная бюджэтная ўстанова навукі Архіў Расійскай акадэміі навук. Партнёрам выступае Прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Беларусі — Расійскі цэнтр навукі і культуры ў Мінску. Пералічэнне неабходнае: калегі істотна дапоўнілі выстаўку галоўнай асобы праекта — Івана Міско, народнага мастака Беларусі.

Аднак спачатку звернемся да своеасаблівай дакументальнай часткі выстаўкі. Гаворка найперш аб прадметах, якія належалі першаму ў свеце касманаўту Юрыю Гагарыну, — кашулі (размер нагадвае аб тым, што Юрый Аляксеевіч быў невысокага росту — 157 см), кнізе і фотаздымках з яго аўтографам. Рэчы належаць сям'і Героя Савецкага Саюза. Дарэчы, на адкрыцці выстаўкі «Дыялог з космасам» прысутнічала пляменніца першага касманаўта Наталля Гагарына, супрацоўніца аб'яднанага мемарыяльнага музея-запаведніка Ю. А. Гагарына. Гэта яна спрычынілася да таго, каб дапоўніць экспазіцыю каштоўнымі экспанатамі.

У гасцях у Ганны Цімафееўны Гагарынай.

Значная частка экспазіцыі — хроніка падзей 12 красавіка 1961 года, дня, які падзяліў гісторыю на «да» і «пасля». Гледача парадуюць дакладная храналогія, рэдкія здымкі, успаміны касманаўта. Шлях Юрыя Гагарына ад абуджэння ў 5.30 раніцы да прызямлення ў 10.55 пасля палёту, які доўжыўся 108 хвілін, — усё нібы як на старонках падручніка, які дапаўняецца дадатковым фатаграфічным матэрыялам. Дзякуючы яму мы бачым мужчыну ў звычайных жыццёвых абставінах. Міфалагізацыя і канструяванне героя, якімі ўпарта займаліся на працягу дзесяцігоддзяў, адыходзяць на другі план… Хоць, натуральна, не вельмі ахвотна. Ды і не ставілася такой задачы для праекта, прысвечанага Дню касманаўтыкі. Завяршаюць асобны расповед шчымлівыя старонкі: здымкі, якія паказваюць развітанне з Юрыем Гагарыным, нумары газет «Известия», «Комсомольская правда», «Сельская жизнь» з жалобнымі фота і тэкстамі, напоўненымі асэнсаваннем трагедыі і незаменнай страты.

Іван Міско «Брытанскі касманаўт Хелен Шармен», 1992 г.

Другім складнікам дакументальнай часткі можна лічыць сціплы расповед пра жыццё і творчасць Івана Міско. Спачатку чорна-белыя, затым каляровыя фотаздымкі паказваюць аўтара, незнаёмага прадстаўніку маладога пакалення. З героямі і побач з сябрамі, у майстэрні і на выстаўцы — скульптар заўсёды добразычлівы і ўсмешлівы, прытым паўсюль угадваецца яго задуменнасць. Многія кадры агульнавядомыя і папулярныя да сёння, як, напрыклад, першы эцюд з Пятром Клімуком (1975) ці выява Ганны Цімафееўны Гагарынай у майстэрні ў скульптара (1980). Аднак хапае іншых матэрыялаў, вартых увагі шырокага кола гледачоў. Магчыма, не кожная з іх валодае той мастацкай вартасцю, што прыцягвае і прымушае запомніцца, аднак выдатна дапаўняе інфармацыйны пласт.

Натуральна, гэта далёка не ўвесь фатаграфічны матэрыял, якім могуць пахваліцца арганізатары выстаўкі «Дыялог з космасам». Ілюстрацыі, абавязковыя і факультатыўныя, дапамагаюць арыентавацца ў змесце экспазіцыі і адчуць той асаблівы настрой, з якім звяртаюцца да наведвальніка выстаўкі ў кожнай яе зале. Улавіць яго складана, толькі месцамі — трэба засяродзіцца на кожным, нават самым непрыкметным, экзэмпляры. Такіх, дарэчы, мала. Паўсюль маштаб і раздолле — гэтага заслугоўвае тэма. Чаго варты здымак, зроблены ў 2013 годзе з борта МКС. На ім адлюстраваны Мінск з вышыні 450 км. Суправаджае яго аўтограф Алега Навіцкага, які і падарыў фотакартку Музею горада Мінска.

Іван Міско — выключная постаць у айчынным мастацтве. І не толькі. Ён стварыў партрэты шматлікіх вядомых і паважаных людзей: навукоўцаў, артыстаў, музыкантаў, спартсменаў… Нягледзячы на рознабаковасць у жанрах і тэмах, найбольш прыцягальным для сучаснага гледача стаў космас у пераасэнсаванні Івана Якімавіча. Сярод яго герояў — многія касманаўты былога Савецкага Саюза, прадстаўнікі іншых краін, якія пабылі на арбіце. Яго майстэрню наведвалі шматлікія ўдзельнікі інтэрнацыянальных экіпажаў. Дзякуючы таму, што скульптар быў знаёмы са сваімі героямі, бюсты выглядаюць вельмі дакладнымі. Мастак заўсёды паўтарае словы ўдзячнасці вялікай праграме «Інтэркосмас», у якой быў задзейнічаны. Менавіта яна дала магчымасць пазнаёміцца з касманаўтамі розных краін. Між тым шмат увагі прыцягваюць да сябе і персоны, блізкія беларускаму гледачу: Уладзімір Кавалёнак, Пётр Клімук і Алег Навіцкі.

Фрагмент хронікі падзей 12 красавіка 1961 года.

Скульптар Іван Міско, якога з часам сталі называць «зорным», «касмічным», зрабіў шмат прысвячэнняў Юрыю Гагарыну — яго постаццю і касманаўтыкай увогуле творца захапіўся ў год, калі першы касманаўт загінуў. З яго маці склаліся прыязныя стасункі: Ганна Цімафееўна гасцявала ў мінскай майстэрні больш за 20 разоў. Мастак нават стварыў надмагілле сям'і Гагарыных: Аляксея Іванавіча і Барыса — бацькі і брата першага касманаўта. Пазней Івану Міско давялося рабіць надмагільны помнік самой Ганны Цімафееўны.

Іван Якімавіч — вельмі актыўны творца. Шмат працуе ў майстэрні і паспявае наведваць многія мінскія выстаўкі. На адкрыцці персанальнай ён расказаў пра стварэнне мемарыяльнага медаля, прысвечанага палётам у космас. Мэтр абвясціў аб тым, што твор «12 красавіка» (2021) ён дорыць гораду Гагарыну на вечнае захоўванне. Кампазіцыя стане макетам для вырабу вялікага мемарыяльнага знака, што будзе ўсталяваны на ўездзе.

Павіншаваць мастака з адкрыццём выстаўкі прыйшло шмат гасцей, сярод якіх — акадэмік НАН Беларусі, кіраўнік Нацыянальнага агенцтва па касмічных даследаваннях Пётр Віцязь. Ён адзначыў: «Скульптар Іван Міско прысвяціў жыццё паказу людзей, якія заваёўваюць космас, працуюць там. Гэта па сілах толькі людзям унутрана багатым, якія разумеюць мастацтва, літаратуру, якія паважаюць гісторыю сваёй краіны. Гэта і нам, вучоным, дапамагае вырашаць навукова-тэхнічныя задачы па асваенні касмічнай прасторы».

Выстаўка «Дыялог з космасам» атрымалася даволі змястоўнай і насычанай. Адзінае, чаго ўсё ж такі не хапіла, — самой скульптуры. Тлумачэнне: у экспазіцыі змешчана вельмі шмат бюстаў розных касманаўтаў, створаных у розныя дзесяцігоддзі. Але гэтая галерэя даволі слаба «разбаўлена» творамі іншых жанраў. Мастак прадставіў сімвалічныя кампазіцыі «Камета» (2000—2010), «Космас» (2018), «Што там за гарызонтам?» (2017) і некалькі іншых, але гэтага мала. Ёсць упэўненасць, што зорцы айчыннага мастацтва ёсць што сказаць гледачу, але з-за накіраванасці сумеснай выстаўкі, з-за вялікай колькасці арганізатараў гэтага не ўдалося зрабіць.

Між тым дапаўняюць выстаўку копіі графічных работ мастакоў-фантастаў. Гэта віды савецкага спадарожніка, выхаду чалавека ў адкрыты космас, касмадрома «Байканур», касмічнага апарата на спадарожніку Марса Фобасе з фондаў Музея-запаведніка Ю. А. Гагарына.

Фрагмент кампазіцыі Івана Міско, прысвечанай касманаўту-мастаку Аляксею Ляонаву, 2000 г.

Наведаць экспазіцыю ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага можна да 30 красавіка.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Фрагмент экспазіцыі, прысвечаны маці касманаўтаў.

Атмасфера месца

Незвычайная экспазіцыя графікі і скетча «*Big city life*» працуе ў прасторы *ZAL* #2. Гэта другая зала галерэі «Арт-Беларусь» у Палацы мастацтва. Праект сабраў работы маладых мастакоў, якія адлюстроўваюць навакольнае асяроддзе і паўсядзённасць. Як яны яе ўяўляюць, якой бачаць і перадаюць на паперы — тэма даволі прадстаўнічай выстаўкі. Куратарам выступае Кацярына Янкоўская.

«*Big city life*» знаёміць з творчасцю, як падкрэсліваюць арганізатары, найбольш актуальных беларускіх аўтараў. Гэта Ганна Кохан, Вераніка Талецкая, Лізавета Емяльянава, Міхаіл Дайлідаў, Марыя Сыракваш і Наталля Язерская. Такім чынам, выстаўка падкрэслівае не толькі важнасць ведання творчасці маладых мастакоў, але і рознабаковасць іх зацікаўленняў, схільнасць да эксперыментаў у тым кірунку, якому ў Беларусі надаецца не так шмат увагі.

Паняцце «скетч» паходзіць ад англійскага слова «*sketch*» — хуткі малюнак, які дапамагае адлюстраваць галоўную ідэю, задуму. Першапачаткова скетчамі называлі хуткія і, што важна, віртуозныя замалёўкі горада, архітэктуры, людзей і модных вобразаў, прадметаў — усяго, што па тэхніцы выканання прадугледжвае хуткасць, стылізацыю, упэўненасць і творчую свабоду. Цяпер да гэтага кірунку адносяць таксама малюнкі, выкананыя не толькі ў сучаснай, але нават і ў акадэмічнай манеры. Яны могуць быць як паўабстрактнымі, так і дэтальнымі і вельмі дакладнымі ў адлюстраванні нейкай з'явы рэчаіснасці.

Лізавета Емяльянава «Сцэна на Камароўцы I», 2017 г.

Матэрыялы выкарыстоўваюцца вельмі розныя: акварэль, туш, каляровыя і акварэльныя алоўкі, вугаль, каляровае чарніла, пастэль. Распаўсюджаны таксама сучасныя графічныя прылады: пан-пастэль, акварэльныя маркеры, розныя лінеры. Цікавыя вынікі дае змешванне тэхнік — выстаўка «*Big city life*» гэта пацвярджае.

Што тычыцца скетча, прысвечанага гарадской прасторы, то найбольш важны аспект — уменне перадаць настрой і атмасферу месца. У гэтым хаваецца і пытанне дасканаласці: хтосьці мяркуе, што неабходна правільна перадаць маштабы адлюстраванага, паказаць дэталі і асаблівасці месца. Іншыя, як арганізатары выстаўкі ў прасторы *ZAL*#2, схільны лічыць, што ў скетчынгу не патрабуецца дакладнае капіраванне, галоўнае — зафіксаваць успрыманне мастаком гарадскога асяроддзя ў пэўны момант.

Ганна Кохан «Токіа», 2020 г.

Графіка, як мы ведаем, — мастацтва таксама шмат у чым умоўнае. Галоўныя яе характарысткі — лаканічнасць мастацкай манеры і ёмістасць вобразаў. Усё гэта для стварэння неабходнага эфекту недаказанасці, нягледзячы на тое, што мастакі, як правіла, ствараюць неймаверна дакладныя сюжэты. І тут трэба нагадаць: графіка ў большай ступені — жанр унікальны, бо здольны адлюстраваць разнастайнасць таго ж горада, што складана зрабіць у скетчы.

Чаму арганізатары вырашылі аб'яднаць два кірункі, пытанне складанае. Можна толькі меркаваць, што вартых увагі скетчаў (зноў жа — на думку арганізатараў) не так і шмат і цэльнай экспазіцыі магло не атрымацца. А паказаць напрацоўкі і, магчыма, даць штуршок для новых пошукаў — справа пахвальная.



Міхаіл Дайлідаў «Новы дом», 2015 г.

Лейтматыў экспазіцыі — прыстасаванне асобнага чалавека ў зменлівых умовах рэчаіснасці. Хтосьці глядзіць на горад у аддаленасці, захоўваючы пэўную дыстанцыю (прыклад — «Італьянскі двор у Тбілісі» (2021) Наталлі Язерскай), а нехта імкнецца стаць яго неад'емнай часткай («Раніца ў гарадскім кафэ» (2022) Лізаветы Емяльянавай). Як паказваюць работы экспазіцыі, большасць мастакоў усё ж адносяцца да першай «групы» — супрацьпастаўляюць сябе гораду, знаходзяцца з ім у актыўным дыялогу. Яркай яго ўдзельніцай з'яўляецца Ганна Кохан: сюжэты «Будні» (2022), «Рух» (2022), «Маладосць» (2022), «Плынь» (2022), «Токіа» (2020) расказваюць пра, здаецца, непазбежнае адзіноцтва і пошук адказаў на пытанні, што хвалююць. А адказы патрэбна даваць — і сабе, і іншым.

Вераніка Талецкая «Seine Embankment», 2021 г.

Многія аўтары разважаюць пра трывогу, звязаную, апроч іншага, з адчуваннем няўтульнасці ў мегаполісе, якім бы прыгожым і камфортным ён ні быў. У гэтым рэчышчы звяртаюць на сябе ўвагу работы Марыі Сыракваш, Міхаіла Дайлідава, той жа Ганны Кохан. Мастакі робяць гэта ў даволі спакойнай манеры — часам такім чынам, што гледача падобныя пачуцці амаль не закранаюць.

Калі да гэтага гаворка была ў асноўным пра чорна-белыя скетчы і графіку, то далей яна пойдзе пра колер. І, трэба сказаць, у выпадку з выстаўкай «*Big city life*» ён кардынальным чынам мяняе стаўленне да экспазіцыі, а дакладней — да агульнага настрою. Сустракаюцца сюжэты і жыццесцвярджальныя, і натхняльныя, і шмат у чым рамантычныя. У іх адлюстроўваецца аўтарскае бачанне прыгожага, светлага, лірычнага. Говорка найперш пра кампазіцыі Веранікі Талецкай і Лізаветы Емяльянавай, у якіх заўважна спакойнае сузіранне і імкненне дагадзіць гледачу. І ў дадзеным выпадку гэта прыемна.

Колькі слоў хочацца сказаць пра канцэпцыю праекта «*Big city life*». Апошнім часам асаблівых намаганняў у кірунку прадумвання арганізацыі прасторы не назіраецца — большасць выставак юбілейныя, аглядныя, рэтраспектыўныя, дзе ўся ўвага, як мяркуецца, павінна канцэнтравацца на творы. Стваральнікі экспазіцыі ў прасторы *ZAL* #2 задумаліся пра тое, што не заўсёды дастаткова аднаго толькі мастацтва — з залай, асабліва ўжо звыклай для гледача, неабходна працаваць. Галоўнае, што зрабілі для сённяшняга праекта арганізатары, — дадалі ў яго жыцця, прымусілі адчуць павеў свежага ветру, які не збіраецца збіць з ног, а толькі песціць.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

З непавярхоўным поглядам на звыклае

Бібліятэка можа быць прыдатнай пляцоўкай для экспанавання прафесійных твораў мастацтва. Апошнім часам да такога фармату ўсё часцей звяртаюцца некаторыя кніжніцы Мінска і рэгіёнаў. Аднак не кожны мастак пагодзіцца на такую прастору для выстаўкі. Ды і ці падыдуць для гэтага творы любога жанру і стылю? Эксперыменты ў гэтым кірунку адкідваюцца, таму ў біблятэках можна сустрэць пераважна пейзаж і нацюрморт. Здараецца, перад гледачом паўстаюць абстракцыі.

Да 1 мая ў галерэі «Лабірынт» (3 паверх Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) будзе працаваць выстаўка «На мяжы рэальнасці», прымеркаваная да 65-годдзя Рыгора Мяжуева. Экспазіцыя падрыхтавана ў рамках Года міру і стваральнай працы. Так, гледача знаёмяць з беларускімі пейзажамі і класічнымі нацюрмортамі, а таксама з абстрактнымі кампазіцыямі. На працягу ўсяго творчага шляху мастак імкнецца паяднаць эксперымент і класіку. Паняцце «мяжа», выкарыстанае і ў назве выстаўкі, вельмі дарэчы.

Рыгор Мяжуеў — выпускнік мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута (цяпер — Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава). Вучыўся ў Алега Арлова, Івана Сталярова, Пятра Анашчанкі. Працуе ў жывапісе і акварэлі ў жанрах пейзажа, нацюрморта і партрэта. З 1996 г. прымае ўдзел у шматлікіх беларускіх мастацкіх выстаўках акварэлі і зборных выставачных праектах. Мастак выкладае малюнак і кампазіцыю ў гімназіі-каледжы мастацтваў у Маладзечне.

У цэнтры ўвагі Рыгора Васільевіча — прырода, былыя фальваркі і старыя замкі. «Кранальныя, цёплыя беларускія краявіды, камерныя, рамантычныя нацюрморты выкананы з бездакорным майстэрствам і глыбокай павагай да беларускай гісторыі і традыцый, — адзначаюць у НББ. — Мінулае паўстае як бы застылым у часе, з адценнем настальгіі, асэнсаванасці сённяшняга дня. Мовай геаметрычных фігур, прыгажосцю сіметрыі, гармоніяй ліній перакрыжаванняў і паралеляў, колераў і адценняў мастак у абстрактных работах перадае сваё ўяўленне аб сусвеце». Гэта дастаткова падрабязнае апісанне творчасці майстра акварэлі, да якога складана штосьці дадаць. Сапраўды, Рыгор Мяжуеў выступае як тонкі назіральнік, якому нецікавы

Фрагмент экспазіцыі.

павярхоўны погляд на звыклае. Да таго ж ён імкнецца адлюстраваць не толькі навакольны свет, але і ўнутраны (гэтым асобным прасторам таксама выдатна падыходзяць катэгорыі «мяжа», «сумежжа»). Дапамагаюць яму ў гэтым нават пейзажы, да якіх звяртаецца ледзь не кожны акварэліст ці графік. Шмат увагі творца надае куточкам, звязаным з Янкам Купалам і Максімам Багдановічам. Сярод любімых мясцін — маладзечанскі край. Тэматыка, здаецца, болей чым распрацаваная, але падыход Рыгора Мяжуева здольны прыцягнуць увагу, схіліць да роздумаў.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Сонечнае спляценне танца

Вясна — час абуджэння ад зімовага сну не толькі прыроды, але і чалавека. З першымі промнямі сонца ў сэрцы нараджаюцца забытыя за месяцы марозаў пачуцці. Няма ў мінскіх тэатрах больш адпаведнай часу пастаноўкі, чым новая версія «Дона Кіхота» ў Вялікім.

Хітрамудры ідальга

Раман іспанскага пісьменніка Мігеля дэ Сервантэса «Хітры ідальга Дон Кіхот Ламанчскі» быў задуманы як пародыя на рыцарскія раманы. На пачатку XVII стагоддзя сапраўдныя рыцары сыходзілі ў нябыт, усе заморскія землі былі захоплены, і патрэба ў іх адпала. Разам з гэтым знікла і неабходнасць іх усхваляць. Новыя часы патрабавалі новых герояў альбо антыгерояў. Менавіта Дон Кіхот стаў прыкладам чалавека іншых часоў, якія прыйшлі пасля эпохі Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.

Надзвычай яскравы вобраз чалавека, у якога атрымалася зразумець вонкавы вобраз рыцараў, але не наблізіцца да разумення ўнутраных канфліктаў. Стварэнне Дона Кіхота дазволіла Сервантэсу застацца адным з самых яркіх аўтараў да нашых дзён. Твор перакладзены на ўсе еўрапейскія мовы (на беларускую ў 1999 годзе раман пераставарыў Міхась Пазнякоў), вытрымаў больш за 50 экранізацый. А пасля з'явіўся балет…

Музычную частку пастаноўкі напісаў аўстрыйскі кампазітар Людвіг Мінкус, які доўгі час пражыў у Расіі. У той час ён супрацоўнічаў з рускім балетмайстрам французскага паходжання Марыусам Петыпа. Прэм'ера балетнага спектакля адбылася 14 снежня 1869 года на сцэне маскоўскага Вялікага тэатра.

Пазней першапачатковая харэаграфія Петыпа будзе дапоўнена, абноўлена і ўпрыгожана мастацкімі вынаходкамі такіх выбітных, сусветна вядомых балетмайстраў, як Аляксандр Горскі, Касьян Галейзоўскі, Валянцін Елізар'еў і іншыя. Найменш змен атрымала музыка Мінкуса, якую тэатральныя крытыкі параўноўвалі з іскрыстым шампанскім.

У танцавальнай пастаноўцы Дон Кіхот пераўтвараецца з цэнтральнага

персанажа ў другаснага. На першы план выходзіць гісторыя кахання Кітры і Базыля. Усе жыхары Барселоны, цэнтральнае месца падзей, сабраліся на плошчы, каб танцаваць, танцаваць, танцаваць.

У сваіх мемуарах, наведаўшы Іспанію, Марыус Петыпа тлумачыў палкасць танцаў: «Гарачыя, імпэтныя дзеці шчаслівай Андалузіі да бяспамяцтва захапляюцца сваімі нацыянальнымі танцамі: ні стаяць, ні сядзець яны не могуць на месцы, калі пачынаюцца гэтыя вельмі бравурныя танцы… Крыкі, віскат, рогат, кіданне плашчоў пад ногі танцорак — вось і забыліся на жыццё з нейкімі няўдачамі. У натоўпу толькі адзін культ — страсць…»

154 гады існуе балет, заснаваны на вялікім творы, які даўно выйшаў за межы іспанскай літаратуры і стаў помнікам сусветнага мастацтва. Наколькі лёгка і дасціпна вядзе сваю гісторыю Мігель дэ Сервантэс — з такім жа непараўнальным запалам і вяселлем разгортваецца балетная пастаноўка. Гэта дазваляе смела назваць яе адной з самых радасных ва ўсёй спадчыне класічнага балета.

Беларускі спадар Кіхот

Балет на музыку Л. Мінкуса папулярны ва ўсім свеце. Не стала выключэннем і Беларусь. На сцэне Вялікага тэатра Беларусі 24 і 25 сакавіка адбылася прэм'ера сёмай версіі знакамітага балета. Дагэтуль «Дон Кіхот» быў пастаўлены ў 1941-м, затым — у 1947-м, 1952-м, 1962-м, 1979-м. Апошні варыянт 1989 года да нядаўняга часу ішоў на беларускай сцэне. Яго таксама ажыццявіў Валянцін Елізар'еў.

«Версія 1989 года пратрымалася на сцэне 34 гады. Для спектакля гэта вельмі вялікі тэрмін. Я думаю, што пастаноўка трымалася перадусім дзякуючы добрым выканаўцам. Таксама і канструкцыя балета дастаткова моцная», — згадваў знакаміты харэограф.

Прайшоўшы такі доўгі жыццёвы шлях, спектакль папярэдняй версіі патрабаваў грунтоўных змен. Сам мастацкі кіраўнік Вялікага абазначае гэта так: «З часам, на жаль, трухлеюць дэкарацыі і касцюмы, губляецца свежасць харэаграфіі. Кожны выканаўца штосьці са свайго боку паляпшае, не зважаючы на агульную карціну. Гэта перапаўняе спектакль. Наша мэта — абнавіць пастаноўку, удыхнуць новае жыццё. У новай версіі змены атрымалі лібрэта, дэкарацыі і часткова харэаграфія».

У гэтай пастаноўцы Валянцін Елізар'еў звяртаецца да харэаграфічнай спадчыны сваіх папярэднікаў. Яго віртуознасць і смеласць сплецены з найлепшымі набыткамі творчых падыходаў М. Петыпа, А. Горскага, К. Галейзоўскага. Дырыжорам-пастаноўшчыкам выступіў заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Мікалай Калядка.

Грунтоўныя змены ў дэкарацыях і касцюмах танцораў ажыццявіў народны мастак Расіі Вячаслаў Окунеў. Мастак па святле — Ніна Іванкіна.

У галоўных ролях задзейнічаны вядучыя салісты і салісткі Вялікага тэатра Беларусі. Кітры — Людміла Хітрова, Ірына Яромкіна, Базыль — Дзмітрый Уксуснікаў, Аляксандр Місюк, Мерсэдэс — Лізавета Мусорына, Марына Вежнавец, Дон Кіхот — Антон Краўчанка, Кірыл Фурман і г. д.

Спектакль выпраменьвае святло і радасць. Напоўнены жартамі і бяскрыўднымі кпінамі балет здольны зацікавіць нават самага патрабавальнага гледача. Спалучэнне праверанай харэаграфіі і музычнага складніка зачароўваюць.

Як і папярэднікі, Елізар'еў адыходзіць ад класічнага балета і смела звяртаецца да нацыянальных іспанскіх і цыганскіх танцаў — шыка, марэна і зінгара. Радасць і сонечнасць новай пастаноўкі не дазваляюць адвесці погляд ад сцэны.

Гісторыя кахання Кітры і Базыля не трагічная, не драматычная. Ствараецца ўражанне, што на залітых сонцам вуліцах іспанскага горада немагчыма ўявіць гора, праблемы, нягоды. Ні на імгненне глядач не паверыць, што ў багатага Гамаша, які хоча стаць мужам Кітры, атрымаецца задуманае. Сонца і смех абяцаюць шчаслівы канец.

У такую ж напаўпрыродную (альбо надпрыродную) з'яву ператвараюцца балетны Дон Кіхот і яго верны спадарожнік Санча Панса. Сэрца рыцара аддадзена найпрыгажэйшай з жанчын Дульсінеі Табоскай, яна скразным, але не яўным вобразам праходзіць праз усе дзве гадзіны прамяністага балета. Таму, даведаўшыся аб няпростай сітуацыі маладых людзей, ён нарэшце можа адчуць сябе сапраўдным рыцарам. З гонарам і годнасцю.

Яна ЦЭГЛА
Фота Ірыны МАЛАХАВАЙ

Тэт-а-тэт

Студэнцкія спектаклі — падзеі асаблівага роду. З аднога боку, жывасць, маладосць і імпэт кампенсуюць любыя недахопы майстэрства, а з іншага — далёка не заўсёды можна здагадацца, хто з акцёраў хутка з'явіцца на тэатральных афішах, а для каго студэнцкія спектаклі так і застануцца адзіным досведам.

«Я не загадка, Фрэйд, а таямніца», — абвяшчае афіша да дыпломнага спектакля студэнтаў чацвёртага курса спецыяльнасці «Акцёрскае майстэрства (драматычны тэатр і кіно)» тэатральнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Прэм'ера спектакля «Госць» адбылася 29 сакавіка ў вялікай зале вучэбнага тэатра-студыі імя Е. Міровіча.

Асновай для пастаноўкі стала п'еса «Наведвальнік» французска-бельгійскага драматурга і пісьменніка Эрыка-Эмануэля Шміта. Твор з'явіўся ў 1993-м і прынёс аўтару шырокую вядомасць у краінах Еўропы, а таксама прэмію Мальера.

У цэнтры гісторыі — знакаміты псіхааналітык Зігмунд Фрэйд, вядомы сваімі атэістычнымі поглядамі. Месца і час дзеяння — Вена, 1938 год. Росквіт нацыянал-сацыялізму, ужо адбыўся аншлюс Аўстрыі, і краіна ўвайшла ў склад Германіі. Цяжкія гады, калі ўвесь час даводзіцца баяцца за сваё жыццё і лёс блізкіх, калі ў любы момант могуць прыйсці прадстаўнікі сумна вядомых службаў. Сам Фрэйд ужо смяротна хворы на рак горла, але ўсё яшчэ не з'язджае з акупаванай сталіцы, негледзячы на тое, што ўся сусветная супольнасць настойвае на яго ад'ездзе, а нацысты не перашкаджаюць.

І нечакана праз акно да знакамітага навукоўца прыходзіць госць. Далёка не адразу доктар Фрэйд пачынае разумець, што перад ім не пацыент псіхіятрычнай клінікі альбо выпадковы прахожы. Перад ім Бог. Паміж імі адбываецца дыялог. Грунтоўная гутарка, спрэчка, дыспут.

Пагадзіцеся, аснова спектакля ўяўляе сабой насычаны тэалагічнымі роздумамі і чалавечымі пакутамі твор. Сам аўтар п'есы Э. Шміт выказваўся аб сваім стаўленні да Бога цьмяна: «Я — агностык, які верыць. На пытанне аб існаванні Бога я прывык адказваць, што не ведаю, але лічу, што так. Яго існаванне немагчыма давесці навуковым і рацыянальным шляхам, але яно спасцігаецца з дапамогай веры».

Пастаноўшчык спектакля — загадчыца кафедры акцёрскага майстэрства Наталля Башава. З выкладчыцкай уважлівасцю і мастацкай інтуіцыяй яна падышла да трансфармацыі і адаптацыі літаратурнага тэксту для маладых акцёраў. У выніку рэжысёр абрала шлях балансу, і ён прасочваецца на працягу ўсяго спектакля.

Так, спачатку можна разгубіцца ад таго, што нібыта стары і смяротна хворы Фрэйд жвава рухаецца па сцэне і спакойна прамаўляе доўгія тырады. Аднак у гэтым — задума аўтара. У п'есе менавіта гэта пазначана як вырашальны момант. Сам Зігмунд Фрэйд не згаджаўся са сваім узростам, што і паказваў усімі магчымымі спосабамі. Кпіць з яго ў размове і сам Бог.

На карысць спектакля, які ўсё ж разгортваецца ў сценах вучэбнай установы ў краіне, якая непапраўна моцна пацярпела ад нацызму, пайшло і выключэнне празмернай грубасці, якая месцамі ўскладняе чытанне літаратурнага твора. Ніякай крамолы Эрых-Эмануэль Шміт не закладае, аднак роздумы аб лёсе іўдзейскага народа і супрацоўнікаў гестапа наўрад ці адпавядаюць нашаму сённяшняму дню.

Добрая крыніца тэксту і ўважлівае стаўленне рэжысёра-пастаноўшчыка да адаптацыі твора дазваляюць заззяць у святле сафітаў талентам маладых акцёраў. Фрэйд, госць, Ганна, гестапавец — кожнага з персанажаў можа выканаць толькі артыст пэўнага тыпажу. А вызначэнне такога роду ўжо ва ўніверсітэце закладае далейшы шлях.

Няцяжка звярнуць увагу і на высокі, а месцамі і празмерны драматызм падзей, пафас прамоў. Маналогі напоўнены горыччу і шкадаваннем аб гадах, якія мінулі беззваротна, нібыта людзі ва ўзросце толькі такія рэчы і абдумваюць. Аднак і тут ёсць адказ! У арсенале артыста маюцца эмоцыі і ўражанні, з дапамогай якіх прасцей дасягнуць мэты — зачапіць гледача, з'яднацца з ім. Пачуцці болю, гора, страты, крыўды вельмі лёгка і надзвычай глыбока судакранаюцца з чалавекам. Маладому акцёру гэта аблягчае задачу, дазваляе адчуць зваротныя эмоцыі залы.

Валянцін САЛОМА

На вуснах нашчадкаў

Напярэдадні 103-годдзя беларускага паэта і журналіста Аляксея Пысіна ў Магілёўскай абласной бібліятэцы адбыліся XII Пысінскія чытанні «У сяброўстве з зямлёй і зорамі». Навукова-практычная канферэнцыя была прымеркавана да 85-годдзя Магілёўскай вобласці і праз гістарычны аспект у літаратурным краязнаўстве пазнаёміла ўдзельнікаў з літаратурнымі традыцыямі Прыдняпроўскага краю.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел члены Магілёўскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», члены гарадскога літаратурнага аб'яднання «Ветэран», выкладчыкі і навучэнцы Сацыяльна-гуманітарнага каледжа ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны політэхнічны каледж».

Віктар Арцем'еў.

Так супала, што творчае станаўленне Аляксея Пысіна як паэта адбывалася адначасова з росквітам Магілёўскай зямлі. Малады, поўны творчых сіл, перадаваў у сваіх вершах той рашучы запал і добры настрой, з якім магіляўчане-сучаснікі будавалі новае жыццё. Гісторыка-паэтычны нарыс «Летапісец зямлі магілёўскай» дапамог гасцям і ўдзельнікам чытанняў уявіць, якой Магілёўская вобласць была раней, якой бачыў яе Аляксей Васільевіч.

У тым, што пысінскае слова — ідзе, што яно — хвалюе, што яно — на вуснах нашчадкаў, пераканаы нястомны даследчык і папулярызатар творчасці Аляксея Пысіна Віктар Арцем'еў, сябра паэта, найстарэйшы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, нязменны ўдзельнік Пысінскіх чытанняў. Нягледзячы на свой шаноўны ўзрост, ужо колькі гадоў Віктар Іванавіч не здраджвае традыцыі ўшанавання майстэрства пысінскага слова. Гэтым разам ён прымусіў аўдыторыю па-новаму адчуць творчасць паэта, пазнаёміў з пысінскімі залацінкамі і мудраслоўямі, вострай сатырай і тонкім гумарам.

Зямлячка Аляксея Пысіна Алена Раманенка, дырэктар Цэнтралізаванай бібліятэчнай сеткі Краснапольскага раёна, расказала аб адраджэнні літаратурных традыцый у салаўіным, глыбінным Краснапольскім краі, распавяла аб папулярызацыі творчай спадчыны Аляксея Пысіна на яго малой радзіме, дзе ўжо чацвёрты раз адбылося рэгіянальнае свята паэзіі «Вянок Аляксею Пысіну», якое заслужана заняло сваё месца сярод брэндавых мерапрыемстваў раёна.

Па сутнасці, каму, як не бібліятэцы, быць цэнтрам усёй літаратурнай дзейнайсці рэгіёна? У Дрыбінскім раёне гэты напрамак вось ужо на працягу дваццаці пяці гадоў рэалізоўваецца праз дзейнасць клуба творчых сустрэч «Вянок Дрыбіншчыны». З амаль штодзённай карпатлівай сумеснай работай з мясцовымі паэтамі: Віктарам Кудлачовым, Святланай Цмыгуновай, Уладзімірам Бутрамеевым. З вынікамі пазнаёміла Святлана Верам'ёва, дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Дрыбінская бібліятэчная сетка».

Яшчэ адзін куточак нашай вобласці, вельмі багаты на творчыя таленты — Клімавіцкая зямля. Яна стала радзімай цэлай плеяды пісьменнікаў і паэтаў, якія пакінулі важкі след у творчай біяграфіі Магілёўшчыны. Сярод іх — аж чатыры Іваны: Новікаў, Скарынкін, Пехцераў і Бурсаў. Як папулярызуюцца моўныя скарбы роднага краю ў бібліятэках Клімаўшчыны, дзякуючы чаму клімаўчане не губляюць сувязь з гістарычным мінулым сваёй радзімы, расказала Таццяна Даменікан, дырэктар Клімавіцкай бібліятэчнай сеткі.

Так склалася, што кніжніцы памежных рэгіёнаў Беларусі і Расіі ўжо даўно сталі цэнтрамі дыялогу нацыянальных культур. Адным з важных напрамкаў іх дзейнасці з'яўляецца культурнае ўзаемадзеянне паміж пісьменнікамі Саюзнай дзяржавы. На працягу многіх гадоў Магілёўская абласная бібліятэка і члены Магілёўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі плённа супрацоўнічаюць з Бранскай абласной навуковай бібліятэкай імя Фёдара Цютчава і літаратарамі Бранскай абласной арганізацыі Саюза пісьменнікаў Расіі. Гэтая творчая сувязь двух гарадоў-пабрацімаў непарушная і трывалая, бо заснавана на гістарычнай, культурнай і духоўнай супольнасці брацкіх народаў. Анлайн-удзел у рабоце канферэнцыі прыняла Вольга Гарэлая, намеснік дырэктара па навуковай і метадычнай рабоце Бранскай абласной бібліятэкі, якая пазнаёміла з творчасцю мясцовага паэта Аляксандра Малахава, лаўрэата прэміі «Сярэбраная ліра» імя Аляксея Талстога.

Напрыканцы мерапрыемства слова ўзяла магілёўская пісьменніца Жанна Усцінава (Міус), аўтар кніг для дзяцей і не толькі. Як член савета Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі яна праводзіць вялікую работу па ідэалагічным выхаванні дзяцей і моладзі: арганізоўвае сустрэчы з чытачамі ў бібліятэках Магілёва і Чавус, выступае ў навучальных установах, прывівае любоў да чытання і кнігі дзяцям з самага ранняга ўзросту. На добрую памяць аўтар падарыла бібліятэцы сваю новую кнігу «Казачныя ночы Барвулі».

Бессмяротнымі радкамі свайго верша Аляксей Пысін развітаўся з маладымі:

Бяру з сабой нялёгкія дарогі,
Сляды пакут, што не датлелі там,
Бяру з сабой бяссонныя трывогі,
А юны свет — я юным перадам.

Гэтым наказам маладому пакаленню на далейшае жыццё завяршылася канферэнцыя, але работа па літаратурным краязнаўстве будзе, безумоўна, працягвацца.

Юлія КАСЦЮК,
вучоны сакратар установы культуры
«Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
Фота даслана аўтарам

Блізкая да Беларусі

30 сакавіка 2023 года на 71-м годзе жыцця пайшла ў іншы свет сціплы і не чужы для Беларусі чалавек — кітаянка, якую ведалі многія беларускія пісьменнікі, журналісты, перакладчыкі… Сун Сяалань — дачка кітайскага перакладчыка, пісьменніка, вучонага, мастака, русіста і беларусіста Гаа Мана (1926—2017).

Гаа Ман з дачкой.

Будучы чалавекам самадастатковым, здольным на ўласныя здзяйсненні, Сун Сяалань доўгія гады жыцця прысвяціла догляду хворых бацькоў. Мне давялося сустракацца з ёю ў пекінскай кватэры Гаа Мана тройчы — у 2015—2016 гады. Яе ведалі беларускія пісьменнікі, журналісты, літаратуразнаўцы Навум Гальпяровіч, Мікалай Літвінаў, Вераніка Карлюкевіч, Дар'я Нечыпарук, шмат хто яшчэ. Яна ўражвала сціпласцю, гатоўнасцю дапамагчы ў вырашэнні любога пытання. Заўсёды цікавілася клопатамі гасцей Гаа Мана, спрыяла іх доўгім перамовам з вялікім кітайскім перакладчыкам, дапамагала знаходзіць той ці іншы артэфакт, тую ці іншую кнігу ў іх кватэры, якая ўяўлялася багатай бібліятэкай, багатым архівам, сапраўдным музеем сяброўства Кітая, Расіі і Беларусі.

Гаа Ман не карыстаўся камп'ютарам, і Сун Сяалань дапамагала весці яму ліставанне з Беларуссю і ўсім светам. Дзякуючы ёй і ў сталым узросце вялікі кітайскі сябра Беларусі, які яшчэ ў 1958 годзе выдаў у Кітаі ў сваіх і Гэ Баацюаня перакладах кнігу выбранай паэзіі Максіма Танка, прымаў у Пекіне беларускіх літаратараў, дзякуючы свайму багатаму архіву адказваў на шматлікія пытанні.

Пасля смерці Гаа Мана яго дачка рупліва займалася архівам свайго вялікага бацькі, разумеючы, што зробленае ім належыць кітайскай і сусветнай культуры. Літаральна незадоўга да яе смерці пабачыла свет вялікая, грунтоўная кніга пра Гаа Мана, у якой Сун Сяалань прыняла самы чынны ўдзел.

Светлая памяць пра добрага сябра Беларусі і беларускай культуры Сун Сяалань застанецца ў нашых сэрцах, нашай памяці.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

млын навін

* * *

У рамках традыцыйнага штогадовага праекта «Мінскія сакавіны» на сустрэчу з дзеткамі ў дзіцячай бібліятэцы № 6 імя Васіля Віткі завіталі паэт і пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Мазго і кампазітар, аўтар-выканаўца, член Беларускага саюза музычных дзеячаў Валянцін Каваліў.

Творчы дуэт пісьменніка і кампазітара — арганічнае адзінства двух вытокаў — паэзіі і музыкі. Вершы Уладзіміра Мінавіча разнастайныя, даступныя, лёгкія для ўспрымання, шматгранныя. Многія з іх сталі цудоўнымі песнямі, да твораў аўтара звярталіся Э. Ханок, Л. Захлеўны, Э. Зарыцкі.

Валянцін Каваліў з'яўляецца пераможцам і лаўрэатам розных музычных конкурсаў, выкладае ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка. Аўтар цэлага шэрагу вучэбна-метадычных дапаможнікаў па музыцы, нотных зборнікаў і аўтарскіх кампакт-дыскаў пазнаёміў нашых юных чытачоў са сваёй творчасцю.

Асаблівым упрыгажэннем мерапрыемства сталі песні Валянціна Кавалёва, праілюстраваныя дзіцячымі малюнкамі. Безумоўна, школьнікі не засталіся абыякавымі да твораў, якія прагучалі ў выкананні кампазітара, і з задавальненнем адгукнуліся на яго прапанову праспяваць разам караоке.

Таццяна МАКАРЭВІЧ

* * *

28 сакавіка ў Лідскай дзіцячай школе мастацтваў адбылося ўрачыстае свята ў рамках Тыдня праваслаўнай кнігі. Арганізатарамі выступілі Лідская епархія Беларускага экзархата Рускай праваслаўнай царквы і Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы.

Да ўвагі гасцей была прадстаўлена кніжная выстаўка «Праваслаўная кніга — шлях да дабра і міру», якая дэманстравала як старадрукаваную царкоўную літаратуру, так і выданні праваслаўнай літаратуры сучаснай рэдакцыі.

Малебен на пачатак усякай добрай справы правёў епіскап Лідскі і Смаргонскі Парфірый у саслужэнні духавенства Лідскага благачыння. Са словамі прывітання да прысутных звярнуліся сакратар Лідскага епархіяльнага ўпраўлення протаіерэй Максім Цыгель і намеснік старшыні райвыканкама Генадзь Уладыка, які падкрэсліў асаблівую важнасць духоўна-асветніцкай дзейнасці, якую наладзілі духавенства Лідскага благачыння і бібліятэкары. З дакладам «Воін Хрыстовы. Жыровіцкі старац схіархімандрыт Мітрафан (Ільін)» выступіў протаіерэй Генадзь Логін, кандыдат багаслоўя, настаяцель храма ў гонар прарока Іллі вёскі Сурынка. Раённая бібліятэка атрымала ў падарунак кнігу нарысаў пра жыццё насельніка Жыровіцкага Свята-Успенскага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра схіархімандрыта Мітрафана.

Таксама перад удзельнікамі выступіў выкладчык Мінскай духоўнай семінарыі, кандыдат багаслоўя, протадыякан Генадзь Малееў з дакладам «Стаўленне хрысціяніна да сябе». Музычныя нумары прэзентавалі навучэнцы дзіцячай школы мастацтваў.

Дар'я МАРЦІНКЕВІЧ

* * *

Дзень паэзіі — асаблівае свята для тых, хто з ёй непасрэдна звязаны. На Астравеччыне таксама ёсць людзі, якія сябруюць з паэтычным словам, а іх творы друкуюцца ў зборніках, часопісах і газетах.

Працяглы час існуе літаратурнае аб'яднанне «Астравецкай зямлі галасы». Яго ўдзельнікі вырашылі таксама адзначыць свята і сабраліся ў сценах раённай бібліятэкі. Аляксандр Марозаў, кіраўнік аб'яднання, павіншаваў калег са святам, пажадаў натхнення і творчага запалу. Падзяліліся ўражаннямі, пазнаёміліся з літаратурнымі конкурсамі, якія праводзяцца.

Прыгадалі і сакавіцкіх імяніннікаў. Капіталіна Пятроўская, Людміла Кухарэвіч, Святлана Бацюлева, Ганна Чакур прачыталі свае вершы. Міхаіл Клусевіч выканаў пад гітару некалькі песень. Паэзія і музыка ў гэты дзень гучалі асабліва прыгожа і ўзнёсла.

Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ

* * *

Сучасныя бібліятэкары не толькі працуюць з фондамі, але і ладзяць розныя цікавыя мерапрыемствы. Яны адшукваюць таленавітых людзей, каб прэзентаваць іх творчасць тым, хто жыве побач.

Бібліятэкары і аматары паэтычнага слова Зэльвеншчыны з нецярпеннем чакалі сустрэчы-прадстаўлення творчасці маладога паэта-земляка «Новае імя на сузор'і Зэльвеншчыны». Мерапрыемства ладзілася ва ўтульнай зале раённай бібліятэкі. Падчас сустрэчы прысутныя змаглі атрымаць асалоду ад паэтычных радкоў аўтара.

Малады паэт Андрэй Жыдок з задавальненнем прачытаў свае вершы. Прыхільнікі літаратурнага слова былі прыемна здзіўлены, калі госць выканаў некаторыя творы пад гітару. Уразіла іх мілагучнасць. Увазе прысутных быў прадстаўлены зборнік вершаў «Што такое шчасце».

Вольга КАМЯКЕВІЧ

Кветка з літпалетка

«Жыццё маё, як дзікая шыпшына…»

Сімвал здароўя, дабрабыту, хараства, маладосці і кахання, шыпшына згадваецца ў адной з самых рамантычных легенд. Прыгажуня і чарнабровы пастух кахалі адно аднаго і марылі быць разам. Але наляцелі на сяло ардынцы… Іх важак быў уражаны прыгажосцю дзяўчыны і прапанаваў ёй першае месца ў гарэме. Тая адмовілася і збегла. Калі яе дагналі на вяршыні стромы, кінулася ўніз, і там, куды яна ўпала, вырас незвычайнай прыгажосці куст з ружовымі кветкамі. Калі ж ардынскі верхавод працягнуў да яго рукі, галіны куста пакрыліся вострымі калючкамі… Гару тую каля сяла сталі называць Дзявочай.

Цікавая казка пра вынаходлівасць чалавека, дзе галоўныя героі — шыпшына і злы дух абасы, ёсць і ў якутаў. Ішлі побач чалавек і абасы і размаўлялі пра тое, чаго кожны з іх баіцца. Чалавек прызнаўся, што ён баіцца найперш тлушчу, мяса і алею. У адказ на такую шчырасць абасы назваў свой галоўны страх — гэта былі калючкі шыпшыны. Праз пэўны час абасы адчуў голад і захацеў з'есці чалавека, — але той шыбануў у кусты шыпшыны. Абасы не адступіўся: каб выкурыць адтуль чалавека, пачаў кідаць у яго каралкі мяса, тлушчу… Чалавек жа ўдаваў боязь і з'ядаў тое, што ў яго кідалі. Абасы сышоў ні з чым…

Часта шыпшына згадваецца і ў фальклоры як сімвал трагічнага, конавага кахання. У Караткевіча ёсць цудоўная балада, створаная па народных матывах, пад назвай «Шыпшына і ружа». Па сюжэце, гэтыя расліны жылі разам і кахалі адна адну, але прыйшлі заваёўнікі і ўсіх абклалі падаткам. Горды шыпшына не захацеў скарыцца і збег у непраходныя пушчы («Хай цяжка — затое вольны, // А вольнаму добра жыць»), а хатняя ружа засталася, бо не рашылася пакінуць маці («А там, каля старай хаты, // З сівінкаю на лістах // Сумуе хатняя ружа // У чыстых росах-слязах»)… Баладу пра шыпшыну і ружу спявала ў «Легендзе аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны» Дубраўка. Гэтая песня лейтматывам гучыць у творы, яе ўспамінае галоўны герой Рогач.

З лёгкай рукі Уладзіміра Дубоўкі шыпшына стала адным з сімвалаў Беларусі: «О Беларусь, мая шыпшына, // зялёны ліст, чырвоны цвет! // У ветры дзікім не загінеш, // чарнобылем не зарасцеш. <…> Варожасць шляху не зачыніць: // у перашкодах дух расце. // О Беларусь, мая шыпшына, // зялёны ліст, чырвоны цвет!» Верш, напісаны ў 1925 годзе, стаў для Беларусі прарочым. Нягледзячы на шматлікія выпрабаванні і нягоды, жыве і жыць будзе! Не дзіўна, што сапраўдныя паэты з'яўляюцца прарокамі: калісьці Іосіф Бродскі зазначыў, што «прароцтва ў паэтаў — пабочны эфект».

Радкі гэтыя натхнілі на патрыятычныя вершы шмат каго з паэтаў-паслядоўнікаў: іх пазначалі як эпіграф, абыгрывалі гэтыя словы новымі сэнсамі і адценнямі.

У Максіма Лужаніна ёсць верш пад назвай «Загубіла шыпшына залатыя пялёсткі» (1926), дзе лірычны герой сумуе па страчаным каханні:

Загубіла шыпшына залатыя пялёсткі,
залатыя пялёсткі — гэта дзень за гарой.
І адкуль мне сягоння неразгаданы лоскат,
неразгаданы лоскат — імжыць серабро?

Твор быў надрукаваны ў 1-м нумары часопіса «Узвышша» за 1927 год.

І душу лірычнага героя Пятра Глебкі разрываюць пачуцці жалю, тугі і прагі чагосьці нязведанага ў вершы «О, не!..»:

…Да іншых дум, да іншых летуценняў,
Дзе ласкі кволай, як твая, няма,
А ёсць адвага мужная ў імкненнях
І для імкненняў — велічны размах.

Калі яна у кроў маю і жылы
Прасочыцца, як сонца да ліста, —
Тады не зарасце мая магіла:
На ёй шыпшына будзе расцвітаць.

Дарэчы, назву «Шыпшына» меў першы зборнік лірыкі Пятра Глебкі, які пабачыў свет у 1927 годзе ва «Узвышшы».

Адной з любімых кветак была шыпшына і ў Яўгеніі Янішчыц. Паэтка стварыла галерэю непаўторных вобразаў:

…І, з гэтай песняй зліўшыся вышыннай,
Ва ўсёй сваёй яскравай прастаце
Жыццё маё, як дзікая шыпшына,
Хоць колецца, а ўсё-такі — цвіце.

Кветка шыпшыны ў Янішчыц сімвалізуе безумоўнае шчасце, якое, нібы сонца, ні ад чаго не залежыць, а даецца табе толькі за тое, што ты ёсць:

Сустракаемся так рэдка.
Нават святы
Убаку ад нас жывуць, як хутаркі.
Прывязі — прашу —
Шыпшыны мне і мяты
Гаварок палескі наш негаваркі.

Яскравы вобраз шыпшыны створаны і ў вершы Наталлі Кучмель, надзвычай маляўнічы: чытаеш — і адразу бачыш сябе ўнутры ідылічнай карцінкі летняга пераднавальнічнага надвячорка:

Стрыжоў і ластавак мые
Неба вадаваротам.
Шыпшыны губы тугія
Сцялі ружовы рот…

Назву кветкі (на лаціне — Rosa) звязваюць з востравам Родас, адкуль, верагодна, паходзіць ружа. Па іншай версіі, назва ўтварылася ад кельцкага слова «rhodd», што значыць чырвоны, з-за колеру кветак і пладоў. Шыпшына адносіцца да сямейства Ружовых, надзвычай карысная для чалавека і шырока ўжываецца ў народнай медыцыне.

Акрамя вітаміну С, якога ў шыпшыны ў 10 разоў болей, чым у апельсіне і лімоне, плады расліны багатыя на вітаміны Р і К, флаваноіды, караціноіды, дубільныя рэчывы і пекціны. Таксама шмат у пладах антыаксідантаў, яны здольны амаладжваць арганізм, зніжаць боль пры артрыце, добра ўплываць на работу сэрца, павышаць супраціўляльнасць да запаленняў, паскараць аднаўленне тканак, зніжаць пранікальнасць сасудаў, стымулююць разумовыя і фізічныя здольнасці.

Таша ШПАКОЎСКАЯ, фота аўтара

зваротная сувязь

Хто робіць пагоду?

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты. Згодна з абноўленым раскладам, пачуць вершы беларускіх аўтараў у праекце «Адным штрыхом» можна тройчы на дзень. Раніцай і вечарам у праграме «Радыёсерыял» гучыць фантастычны раман Герберта Джорджа Уэлса «Чалавек-невідзімка».

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе старонкі рамана Івана Шамякіна «Крыніцы». У «Радыёбібліятэцы» двойчы на дзень слухайце твор Элізы Ажэшкі «Нізіны». Суботнім вечарам выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі», дзе гучаць апавяданні айчынных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» у выхадныя — вершы Алеся Дудара.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у суботу і нядзелю складуць інсцэніраваныя старонкі рамана Міхаіла Булгакава «Майстар і Маргарыта» і аповесць Рэя Брэдберы «Віно з дзьмухаўцоў», а таксама спектакль-фантазія «Воляю лёсу» паводле раманаў Івана Чыгрынава (да 80-годдзя акцёра, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Рагаўцова).

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». Гэтымі днямі слухайце казкі з кнігі Васіля Шырко «Дзед Манюкін і ўнукі». У выхадныя ў перадачы «Дзіцячы радыётэатр» прагучаць дзве часткі спектакля «Хлопчык з вялікай Місісіпі» паводле Мірыям Мэйсан, літоўская народная казка «Певень Пявун Кукаракун», пастаноўка «Хто робіць пагоду» паводле паэмы-казкі Максіма Лужаніна. Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для маленькіх.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ». У нядзелю радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» пісьменніка, публіцыста Навума Гальпяровіча прапануе сустрэчу з вядучым навуковым супрацоўнікам Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Ірынай Мышкавец. Новы выпуск праекта «Літаратура на радыё» прагучыць у чацвер.

ЛіМ КАЛЯНДАР

10 красавіка — 75-годдзе святкуе Алег Сонін (1948), беларускі кампазітар.

12 красавіка — 90 гадоў з дня нараджэння Валянціны Міхеевай (1933—2016), беларускага скульптара.

12 красавіка — 85 гадоў з дня нараджэння Алеся Масарэнкі (Аляксандра Герасімавіча; 1938—2019), беларускага празаіка, перакладчыка.

12 красавіка — 70-гадовы юбілей святкуе Мікалай Грук (1953), беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

12 красавіка — 70-гадовы юбілей адзначае Канстанцін Калодзіч (1953), беларускі жывапісец.

14 красавіка — 75-годдзе святкуе Валянцін Губараў (1948), беларускі графік, жывапісец.

15 красавіка — 75 гадоў з дня нараджэння Леаніда Маракова (1948—2016), беларускага пісьменніка, журналіста, гісторыка.

15 красавіка — 75-годдзе адзначае Сцяпан Міксюк (1948), член Саюза пісьменнікаў.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ смуткуюць з прычыны раптоўнай смерці паэта Паўла ВЕРАБ'ЁВА і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

7 красавіка — на творчую сустрэчу з дзіцячым пісьменнікам Дзмітрыем Мікалаевым. Пачатак у 12.30.

11 красавіка — у гімназію № 7 на творчую сустрэчу з паэтам Уладзімірам Мазго. Пачатак у 11.30.

12 красавіка — на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міхасём Пазняковым у СШ № 20. Пачатак у 12.20.

12 красавіка — у сталічную школу № 175 на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Ліхтарынка». Пачатак у 09.00.

12 красавіка — у Дзіцячы дом № 5 на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Верасок». Пачатак у 16.00.

13 красавіка — у дзіцячую бібліятэку № 14 на прэзентацыю кнігі Уладзіміра Мазго «Казкі ката-марахода». Пачатак у 12.00.

13 красавіка — на анлайн-сустрэчу з дзіцячымі пісьменнікамі Беларусі і Расіі ў публічную бібліятэку № 7. Пачатак у 15.00.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк
06.04.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 698

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 769
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 23014